ВОГНЕННЫЯ ВЁСКІ. ПОПЕЛЬНЫ ВЕРАСЕНЬ 8–9

РЭКОРДЫ ЛЕАНІДА ТАРАНЕНКІ 12–13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

27 ВЕРАСНЯ 2022 г. АЎТОРАК № 189 (29811)

КАРАТКА

- **Сярэдні заробак у Беларусі ў жніўні склаў Br1665,5.**
- Натарыусы Беларусі 30 верасня бясплатна пракансультуюць пажылых грамадзян і інвалідаў.
- **Цэнтр перадавога аграбізнесу ў Браслаўскім раёне будзе рыхтаваць перспектыўныя кадры.**
- Мемарыяльную дошку ў гонар вядомага беларускага нейрахірурга Смеяновіча адкрылі ў Мінску.
- **Мінлясгас плануе адкрыць магазіны рознічнага гандлю ва ўсіх абласцях Беларусі да красавіка 2023 года.**

ЦЫТАТА ДНЯ

Наталія ПАЎЛЮЧЭНКА, першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны:

«Падчас работы, праведзенай да ўступлення ў сілу ўказа аб зберажэннях да дадатковай пенсіі, было праведзена больш за сем тысяч сустрэч на прадпрыемствах. У дыялогавых пляцоўках удзельнічала больш за мільён працуючых грамадзян. Заўсёды хацелася адчуць зваротную сувязь, цікавасць да новай сістэмы, ці пойдуць людзі ў гэтую сістэму і наколькі яна будзе запатрабавана. Вядома, гэта пакажа наш вопыт рэалізацыі ўказа, але ў ходзе сустрэч з калектывамі пытанняў было вельмі шмат. Як мы цяпер мяркуем, найбольш запатрабаваны будзе фармат пад назвай «тры плюс тры», калі тры працэнты ўтрымлівае з заработнай платы чалавек і плюс тры працэнты пералічвае работадаўца. Гэты фармат, зыходзячы з пытанняў калектываў, найбольш запатрабаваны».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«НАШ КУРС ПРАВІЛЬНЫ, СПРАВА НАША СПРАВЯДЛІВАЯ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў перагаворы з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным. Аб двухбаковай сустрэчы лідары Беларусі і Расіі дамовіліся на нядаўнім саміце ШАС у Самаркандзе.

Фота БелТА.

«Я вельмі рады, што вы знайшлі час для таго, каб прыехаць і пагаварыць па ўсіх пытаннях. Вельмі шмат пытанняў. Яны датычацца і сітуацыі ў рэгіёне, не менш важныя пытанні эканамічнага характару па шэрагу напрамкаў, якія мы абмяркоўвалі раней. Гэта пытанні, звязаныя з нашымі планамі ў галіне хіміі, харчавання, угнаенняў», — адзначыў Уладзімір Пуцін. Ён канстатаваў, што Захадам да гэтага часу блакіруюцца пастаўкі беларускіх угнаенняў на сусветныя рынкі. Прэзідэнт Расіі расказаў, што ў бакоў ёсць канкрэтныя планы па шэрагу буйных праектаў. «У цэлым урад падрыхтаваў гэтыя праекты для рэалізацыі. Усё гэта і абмяркуем», — дадаў Уладзімір Пуцін.

СТАР. 2

РАЗАМ З КУПАЛАМ

З часу, калі ў Вязынцы святкавалі стагадовы юбілей Янкі Купалы, а менавіта ў 1982 годзе, у філіял літаратурнага музея прыйшла працаваць Тамара БІЗЮК. Сёлета музейны стаж супрацоўніцы ў доме паэта ні многа ні мала... сорак гадоў. Пачынала музейным касірам, пазней і да сённяшняга дня — на пасадзе наглядчыцы, захавальніцы фонду. Пад пільнай увагай Тамары Уладзіміраўны — надзейная захаванасць музейных экспанатаў. Кожны дзень на электрычцы яна дабіраецца з Мінска на паўстанак Вязынка — на любімую працу. Сёлета жанчына зноў стала непасрэднай удзельніцай святочнага мерапрыемства — святкавання 140-х угодкаў Песняра (вядома, разам з іншымі супрацоўнікамі музея). Усе яны разам сустракалі гасцей, першымі віталі прыхільнікаў Купалавага слова і ганаровых гасцей, праводзілі экскурсіі для шматлікіх турыстаў.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Разумныя грошы

ЖЫВЫЯ ФІНАНСЫ НЕ ЛЯЖАЦЬ ПАД ПАДУШКАЙ

Як зарабіць на зберажэннях?

Кожны павінен разумець — грошы не павінны ляжаць без справы. Калі ў вас ёсць нейкія зберажэнні, то іх трэба прымусіць прыносіць прыбытак. Найбольш простым і ў той жа час вельмі эфектыўным інструментам з'яўляюцца банкаўскія ўклады або, як іх яшчэ называюць, дэпазіты.

Што трэба ведаць пра ўклады ў нашай краіне перад тым, як прыступіць да выбару прадукту? Уклады ў беларускіх рублях адрозніваюцца высокімі стаўкамі — яны ўстанаўліваюцца такімі для таго, каб абараніць нашы зберажэнні ад інфляцыі. Дэпазіты ў замежнай валюце не прынясуць вялікага даходу. Ужо не прынясуць.

СТАР. 4

myfin.by

«НАШ КУРС ПРАВІЛЬНЫ, СПРАВА НАША СПРАВЯДЛІВАЯ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Мы вельмі шмат гаворым пра тое, як будзем далей жыць, пра перспектывы нашы. Я прааналізаваў усе даручэнні, якія вы давалі ўраду, я — у Беларусі. У нас зрываў практычна няма. Развіццё нашай эканомікі і наогул існаванне нашых дзяржаў змянілася рэзка нават за тры апошнія месяцы. Нам прадказвалі крах, гібель і гэтак далей. Але жыццё разнастайнае: мы камусьці патрэбны, нам хтосьці патрэбны. І мы знайшлі тых партнёраў, якія з намі паспяхова працуюць, з якімі мы працуем і прасоўваем нашу эканоміку», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Па словах беларускага лідара, асаблівую падзяку трэба выказаць грамадзянам, якія ў гэты перыяд падтрымліваюць свае краіны. Ён адзначыў, што ўсё ж такі цяпер няпросты перыяд, калі свет перакуліўся. «Ёсць розныя людзі: і тут, і там хапае іх. Мы іх бачым. І, дзякуй Богу, можа быць. Вось ёсць нейкі водападзел і крытэрый (у нас у 2020 годзе, у Расіі цяпер), які паказвае, хто ёсць хто. У гэтым няма нічога дрэннага», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт працягнуў, што за тры месяцы ўсе значна змяніліся. Убачылі, што можна жыць і існаваць нармальна. «Вы вельмі правільна паўтарылі гэтыя пункты нашых дамоўленасцяў. У нас імпартазамяшчэнне нармальна атрымліваецца. І на сваіх самалётах будзем лётаць. І на ваенных, і на грамадзянскіх (на ваенных мы і так лётаем). І на сваіх аўтамабілях будзем ездзіць. Ніякага страху няма», — заўважыў беларускі лідар. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, харчаванне і ўгнаенне можна купіць, купляюць жа зараз. Хоць цяпер гэта стала складаней. «Блакіруюць там. Не нас, а там блакіруюць: людзей, якія хочуць купіць, якія хочуць заплаціць. Яны іх блакіруюць, а не нас. Але знаходзім жа шляхі і прадаём. Цэны ўзнялі. Не мы іх узнялі. Цяпер паглядзеў навіны ранішнія — уся Еўропа бурліць. Найбагацейшая Германія — усе на вуліцы, усе пратэстуюць. Але ж калісьці гэта пачуюць. Думаю, што пачуюць. Таму наш курс правільны, справа наша справядлівая. Пераможам. У нас выхаду іншага няма, — падкрэсліў ён. — Еўропа, калі яна адшумела (я пра тых за акіянам не кажу), няхай яны думаюць. Я ім ужо тры разы сказаў, што іх будучыня разам з намі. Разам з Расіяй, дзе ёсць усё, што ім трэба. А ў іх ёсць тое, што мы можам у іх купіць. Што ім яшчэ трэба? Проста трэба прымаць адказныя рашэнні. Не хочуць — не трэба», — працягнуў Аляксандр Лукашэнка.

«З павагай (павінны. — **Заўв.**) да нас ставіцца», — заўважыў Уладзімір Пуцін.

«Мы, славяне, з імі размаўляць не будзем без гэтага. Прыніжэння ніхто трываць не будзе. Не кажучы пра Беларусь. Расія — гіганцкая краіна, якія могуць быць прыніжэнні? Мы ж памятаем, як там, у Амерыцы, пачынаючы з папярэдняга прэзідэнта: «Мы — выключэнне». Карону на галаву надзеў — «мы светам будзем кіраваць». Гэта працягваецца і цяпер. Нельга так ставіцца да людзей», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, Беларусь, як і Расія, адкрытая для ўсіх, хто хоча жыць у міры. Ён звярнуў увагу, што расійскі бок пастаянна пра гэта гаворыць. І Беларусь гатовая да гэтага, але знявагі ніхто не пацерпіць. «У рускіх людзей ніколі гэтага не было. І ніхто не дазволіць, ні адзін рускі чалавек, ніводнаму прэзідэнту, у тым ліку і Прэзідэнту Пуціну, не прымлівацца гэтай лініі. Вось уся эканоміка і палітыка. Мы неаднойчы ўжо пра гэта гаварылі і будзем працягваць гаварыць, настойліва прасоўваць гэту палітыку», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Таксама Аляксандр Лукашэнка выказаўся наконт мабілізацыі ў Расіі: «У нас мабілізацыяй палохаюць, тут нехта пабег за мяжу. Слухайце, у Расіі 25 мільёнаў мабілізацыйны рэсурс. Добра, няхай збеглі 30 тысяч, ну, 50 тысяч. А калі б яны тут засталіся, яны што, нашымі людзьмі б былі? Няхай бягуць. Я не ведаю, як вы да гэтага ставіцеся, а я асабліва не перажываў, калі ў 2020 годзе некалькі тысяч выехалі».

Цяпер, паводле слоў Прэзідэнта, большасць беларусаў, якія з'ехалі, прасцюка назад. «І гэтыя прыедуць. Толькі трэба прыняць рашэнне, што з імі рабіць: ці няхай едуць сюды, ці няхай кормяцца там на вольных хлябах. Так рабіць нельга. Можна, урэшце, дамовіцца тут і не бегаць па Еўропах і па Амерыцы, як гэта было ў бальшавіцкую рэвалюцыю і пасля яе. Сітуацыя ж не тая», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Паводле прэс-службы Прэзідэнта.

Парламенцкі дзённік

Ліцэнзаванне ўводзіцца для ўсіх адукацыйных паслуг

Дэпутаты на чарговым пасяджэнні дзявятай сесіі Палаты прадстаўнікоў прынялі ў другім чытанні законапраект «Аб ліцэнзаванні». Цяпер яму будзе падлягаць 37 відаў дзейнасці, у тым ліку ўсе адукацыйныя паслугі — ад дашкольнай да вышэйшай адукацыі.

— Па гэтым законапраекце праведзена вельмі вялікая і няпростая работа. Паступіла вялікая колькасць заўваг. Важна, што камісія пастаралася іх улічыць, дзесьці па розных пытаннях знойдзены кансэнсус. І ў цэлым, лічу, падрыхтаваны якасны і запатрабаваны законапраект, дзе вытрыманы баланс інтарэсаў і дзяржавы, і бізнесу, — адзначыў **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.**

Законапраект дакладна вызначае ліцэнзаваныя віды дзейнасці, органы ліцэнзавання, паўнамоцтвы гэтых органаў, парадак атрымання ліцэнзій, іх прыпынення і спынення, што павышае гарантыі забеспячэння і абароны правоў суб'ектаў ліцэнзавання, а таксама прынцыпы ліцэнзавання.

— Відаў дзейнасці, якія падлягаюць ліцэнзаванню, усяго 37. Яны ўяўляюць павышаную небяспеку для жыцця і здароўя нашых грамадзян, небяспеку для навакольнага асяроддзя і звязаных з высокай рызыкай парушэнняў грамадскіх і дзяржаўных інтарэсаў, правоў і законных інтарэсаў нашых грамадзян, — адзначыў **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Палаты прадстаўнікоў Аляксандр ГРАНКОЎСКІ.** — Законапраектам дакладна вызначаны органы ліцэнзавання з іх паўнамоцтвамі, даліцэнзійныя патрабаванні да саіскалнікаў, ліцэнзійныя патрабаванні ліцэнзіятаў, дакладна вызначаны пералік атрымання ліцэнзіі, прыпынення і яе спыненне, пералік грубых парушэнняў у галіне заканадаўства.

Фота БелТА.

Ліцэнзаванне будзе датычыцца і адукацыйных відаў дзейнасці. Цяпер яму будуць падлягаць дашкольная, пачатковая, базавая і сярэдняя адукацыя. Такім чынам, ліцэнзаванне ахопіць фактычна ўсе паслугі адукацыі.

Таксама дэпутаты прынялі законапраект «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб прымяненні ў Еўразійскім эканамічным саюзе навігацыйных пломбаў для адсочвання перавозак».

— Навігацыйныя пломбы будуць выкарыстоўвацца пры перавозках грузаў не толькі чыгуначным, але і аўтамабільным транспартам ва ўсіх пяці краінах саюза, — расказаў **член Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Палаты прадстаўнікоў Ігар ХЛАБУКІН.** — Можна будзе адсочваць не толькі перамяшчэнне тавару з дапамогай навігацыі, але і ў гэтую электронную пломбу змяшчаць у электронным выглядзе таварна-транспартныя накладныя і іншую суправаджальную дакументацыю. Гэта дазволіць пры перасячэнні межаў паміж краінамі ЕАЭС паскарацъ працэсы. Пломба, якую навешваюць у Беларусі, будзе рухацца па ўсіх пяці краінах без дадатковага кантролю да межаў ЕАЭС.

Таксама дэпутаты прынялі законапраекты «Аб ратыфікацыі папраўкі да Манрэальскага пратакола па рэчывах, якія разбураюць азонавы пласт» і «Аб ратыфікацыі Пратакола аб унясенні змянення ў Пратакол аб умовах і пераходных палажэннях па прымяненні Кыргызскай Рэспублікай Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе ад 29 мая 2014 года, асобных міжнародных дагавораў, якія ўваходзяць у права Еўразійскага эканамічнага саюза, і актаў органаў Еўразійскага эканамічнага саюза Кыргызскай Рэспублікі да Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе ад 29 мая 2014 года, падпісанага 8 мая 2015 г.»

Алена КРАВЕЦ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Падчас страляніны ў школе Іжэўска загінулі 15 чалавек

У выніку стралянины 26 верасня ў школе № 88 расійскага горада Іжэўск загінулі пятнаццаць чалавек, 24 атрымалі раненні. Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на Следчы камітэт Расіі. На месца здарэння аператыўна прыбыў кіраўнік Удмуртыі Аляксандр Брачалаў. Ён паведаміў, што вучні і персанал эвакуіраваны з будынка, на месцы інцыдэнту працуюць усе спецслужбы і «хуткая». Вядома, што сярод загінулых — адзінаццаць дзяцей. Па даных следчых, стралком аказаўся мужчына 1988 года нараджэння, выпускнік іжэўскай школы. Ён быў узброены двума траўматычнымі пісталетамі, перароблёнымі пад стральбу баявымі патронамі. Удакладняецца таксама, што мужчына быў апрануты ў майку з нацысцкай сімволікай. Пасля здзейсненага ён пакончыў з сабой. Па даручэнні кіраўніка Следчага камітэта Расіі Аляксандра Бастрыкіна крымінальную справу аб стральбе на тэрыторыі школы ў Іжэўску будзе расследаваць галоўнае следчае ўпраўленне СК РФ. Ва Удмурцкай Рэспубліцы аб'яўлена трохдзённая жалоба па загінулых.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне Прэзідэнту Расіі Уладзіміру Пуціну ў сувязі з трагедыяй у іжэўскай школе. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў Беларусі з глыбокім смуткам успрынялі страшную трагедыю, якая прывяла да чалавечых ахвяр: «Нясцерпным болем у нашых сэрцах адгукнулася вестка аб гібелі нявінных дзяцей, чые жыцці перарваліся, толькі пачаўшыся». Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў шчырыя спачуванні і адрасаваў словы бязмернага спачування і падтрымкі родным і блізкім загінулых, пажадаў найхутчэйшага выздараўлення пацярпелым.

Сільвіа Берлусконі абраны ў італьянскі сенат

Экс-прэм'ер Італіі Сільвіа Берлусконі на пазачарговых парламенцкіх выбарах абраны ў сенат італьянскага парламента. Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на даныя МУС краіны. 85-гадовы палітык, які з'яўляецца нязменным кіраўніком партыі «Наперад, Італія», перамог у выбарчай акрузе Монца (вобласць Ламбардыя), атрымаўшы большасць галасоў выбаршчыкаў. Цалкам магчыма, што ён зойме пасаду старшыні сената. Гэтая пасада з'яўляецца другой па значнасці пасля прэзідэнцкай. У 2019 годзе экс-прэм'ер Італіі стаў дэпутатам Еўрапарламента, зараз ён пакіне гэтую пасаду. Парламенцкія выбары ў Італіі прайшлі 25 верасня. Па іх выніках лідзіруе правацэнтрысцкая кааліцыя з трох партый — «Браты Італіі», «Наперад, Італія» і «Ліга». Самую значную падтрымку атрымала партыя «Браты Італіі». Лідар гэтай партыі Джорджа Мелані можа стаць новым прэм'ер-міністрам Італіі.

Швейцарцы падтрымалі на рэферэндуме павелічэнне пенсіённага ўзросту для жанчын да 65 гадоў

Жыхары Швейцарыі падтрымалі на рэферэндуме павышэнне ўзросту выхаду на пенсію для жанчын з 64 да 65 гадоў. Такую інфармацыю паведаміла ТАСС са спасылкай на грамадскую тэлекампанію RTS, якая ў анлайн-рэжыме вяла падлік галасоў. Таксама па выніках рэферэндуму адабрэнне ўдзельнікаў атрымала і павелічэнне падатку на дабаўленую вартасць для пакрыцця дэфіцыту сродкаў у пенсіённых фондах. Такім чынам, насельніцтва Швейцарыі прыняло абодва элементы пенсіённай рэформы. Павышэнне пенсіённага ўзросту для жанчын падтрымалі 50,6 працэнта ўдзельнікаў, а павелічэнне ПДВ — 55,1 працэнта. Паэтапнае павелічэнне ўзросту выхаду жанчын Швейцарыі на пенсію пачнецца ў 2025 годзе і скончыцца ў 2028-м, калі пенсіённы ўзрост жанчын зраўняецца з пенсіённым узростам мужчын і складзе 65 гадоў. Цяпер у Швейцарыі 2,6 мільёна пенсіянераў на 8,7 мільёна чалавек насельніцтва.

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні Баскаву Дзмітрыю Юр'евічу, намесніку старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.

Зварот у рэдакцыю

КУДЫ ПАДЗЕЛАСЯ «СЛУЦКАЯ» СМЯТАНА?

Пакуль рыхтавала да друку гэты матэрыял, згадала эпізод з фільма «Брыльянтавая рука». Памятаеце, калі Сямён Сямёнавіч Гарбункоў прыйшоў у краму па жаночы халацік і спытаў: «А ў вас няма такога ж, але з перламутравымі гузікамі?» — «На жаль, няма». — «Няма? Будзем шукаць».

Віктар Шасцюк з вёскі Раз'езд Фалічы Старадарожскага раёна Мінскай вобласці ўжо доўгі час набываў у аўтакраме адну і тую ж смятану — 15 % тлустасці. Вырабляе яе ААТ «Слуцкі сыраробны камбінат». На пачатку жніўня гэтую смятану «крама на колах» перастала прывозіць, але неўзабаве яна з'явілася зноў...

«Як высветлілася, прадавец аўталаўкі, каб я не скардзіўся, купляла за свае грошы смятану ў гарадзе і прадавала яе мне. Касавыя чэкі выпісвала «ад рукі». Узнікае пытанне: чаму ў аўталаўцы не выконваюцца заказы пакупнікоў з глыбінкі — пенсіянераў, ветэранаў, інвалідаў?.. На маю скаргу начальнік Любанскага райпа адказаў, што «слуцкая» смятана 15 % тлустасці ў плёнцы не паступае ў гандлёвую сетку. Відаць, са смятанным заводам не заключылі дагавор?... Калі так, атрымліваецца, што начальства бяздзейнічае? Бо мая любімая смятана ў Старых Дарогах ёсць, і каштуе яна танней, чым у аўтакраме».

Па каментарый я звярнулася ў Любанскае райспажыўтаварыства. Там пацвердзілі, што Віктар Шасцюк прынцыпова купляе толькі смятану 15 % тлустасці фасоўкай 380 грам у поліэтыленавай плёнцы Слуцкага сыраробнага камбіната, бо яна самая танная.

— Мы звярталіся ў ААТ «Слуцкі сыраробны камбінат», рабілі заяўку на смятану, але нам адмовілі, — патлумачыла **першы намеснік старшыні праўлення Любанскага райспажыўтаварыства Аксана РАШЧЭНЯ.** — Вытворца адказаў, што не можа выканаць заяўку на смятану 15 % тлустасці 380 грам у плёнцы, бо наогул не пастаўляе яе ў гандлёвую сетку. Прычына: часовая адсутнасць упакоўкі. Рэшткі ж прадукцыі, якія засталіся на заводзе, яны прадаюць у сваіх фірменных крамах. Паколькі смятана, якую купляе спадар Шасцюк, не паступіла, прадавец аўтакрамы, каб пазбегнуць канфлікту і не спараджаць чарговую скаргу, 11 жніўня купіла яе ў Старых Дарогах у краме «Дабраном» па цане 1.70 руб., а потым 15 жніўня ў фірменнай краме «У Юліі» па 1,68 руб. прадала Віктару Іванавічу Шасцюку. Мы ж пра гэта нічога не ведалі. Вядома, прадавец не мела права так рабіць. Прызналася, што хацела як лепш ... Відавочна, зрабіла гэта не дзеля нажывы, паколькі ў аўтакраме Любанскага райспажыўтаварыства цана той смятаны (з улікам гандлёвай надбаўкі) складала б 1,75 руб.

Віктар Шасцюк аддзячыў прадаўцу тым, што... напісаў скаргу. Маўляў, чаму на дзве капейкі зменшылася цана на смятану.

— З прадаўцом аўтакрамы мы правялі дадатковую вучобу, і яна заверыла, што больш падобных сітуацый не паўторыцца, — дадала Аксана Рашчэня. — За парушэнне правілаў гандлю яна панесла дысцыплінарную адказнасць, ёй аб'яўлена заўвага.

Акрамя таго, кіраўніцтва Любанскага райспажыўтаварыства ў пісьмовай форме выбачылася перад пакупніком за дзеянні прадаўца.

— Асноўнымі пастаўшчыкамі малочнай прадукцыі ў крамы Любанскага райспажыўтаварыства з'яўляюцца Слуцкі сыраробны камбінат, Мінскі малочны завод № 1, «Малочны свет», «Бабулін гладыш», «Белластк». У іх маецца вялікі асартымент смятаны тлустасцю ад 10 % да 26 % і ў поліэтыленавых стаканчыках, і ў плёнцы.

Сёння «слуцкую» смятану 15 % тлустасці ў плёнцы аўтакрама не можа прадаваць, бо яе нам не пастаўляе вытворца. Мы прапаноўвалі пакупніку Шасцюку смятану 15 % тлустасці іншых вытворцаў. Сёння яе выпускаюць і «Бабулін гладыш», і Мінскі малочны завод № 1. Яна каштуе на некалькі капеек даражэй. Але спадар Шасцюк не хоча яе купляць, яму патрэбна менавіта тая, якую выраблявае Слуцкі сыраробны камбінат. І пакупніку ўсё адно, што ў вытворцы няма ўпаковачнай плёнкі, — кажа спецыяліст.

Пасля неаднаразовых скаргаў пакупніка Шасцюка на работу аўтакрамы Любанскае райспажыўтаварыства разам з сельвыканкамам збіралі сход, на які прыходзілі мясцовыя жыхары.

— Усе хвалілі прадаўца, маўляў, выконвае заяўкі, што ні закажаш, усё прывязе. Аўтакрама два разы на тыдзень наведвае тую вёску. Таму замоўлены тавар прывозіцца аператыўна. Дастаткова пакінуць прадаўцу папярэднюю заяўку. Спадар жа Шасцюк, калі яму нешта не падабаецца, замест таго, каб падысці паразмаўляць, адразу піша скаргі. Прычым не чакаючы нашага адказу, адначасова ва ўсе магчымыя інстанцыі.

Вядома, ніхто ў наш час не застрахаваны ад розных форсмажорных абставін. Апошнім часам здараюцца перабоі з пастаўкай вызначаных тавараў. У прыватнасці, былі пытанні па малочнай прадукцыі. Уся краіна ведае, што малако ў тэтрапакетах не прадавалі, бо не было ўпакоўкі. Таму два тыдні мы былі без малака ў тэтрапакетах. Зараз ужо усё наладзіліся, яго нам ужо пастаўляюць.

— Віктар Шасцюк таксама скардзіцца, што ў продажы ў аўталаўцы няма куранят замарожаных. Гэта так? — пацікавіліся мы.

— Сапраўды, былі часовыя цяжкасці па прычыне адсутнасці птушкі ў вытворцы, — тлумачыць Аксана Анатольеўна. — На сёння гэта пытанне таксама вырашанае. Нам удалося атрымаць тры тоны птушкі ў прадпрымальніка па перадаплаце. Таму найбліжэйшым часам курацінай нашы пакупнікі будуць забяспечаны. Мы імкнёмся па магчымасці ўлічваць усе заўвагі і пажаданні пакупнікоў. Калі дапускаем нейкія памылкі, аператыўна стараемся іх выпраўляць.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

Класныя навіны

ШКОЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ ПА ПАЛІЧКАХ: АД «А» ДА «Я»...

Дзяржаўны школьны стандарт пачаў дзейнічаць ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з 1 верасня.

Фота Лізаветы ГОПАД.

Даручэнне распрацаваць дакумент, у якім будуць замацаваны дакладныя патрабаванні — пачынаючы ад арганізацыі ўрока, захавання школьнага этыкету і заканчваючы знешнім выглядам вучня і настаўніка, — было дадзена кіраўніком дзяржавы на Рэспубліканскім педагагічным савеце ў 2021 годзе. Школьны стандарт быў распрацаваны на падставе палажэнняў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, Закона «Аб правах дзіцяці», Кодэкса аб адукацыі і не толькі.

Яго мэта — умацаваць дысцыпліну і правапарадак у школе, стварыць бяспечныя ўмовы знаходжання вучняў ва ўстанове агульнай сярэдняй адукацыі, эфектыўнасць адукацыйнага працэсу і якасць агульнай сярэдняй адукацыі.

У дакументе гаворыцца аб паўнамоцтвах і абавязках установаў адукацыі, аб патрабаваннях да ўмоў рэалізацыі адукацыйных праграм, аб арганізацыі прапускнога рэжыму ў школах. Асобна прапісаны правы і абавязкі ўсіх удзельнікаў адукацыйнага працэсу, занатаваныя правілы карыстання мабільнымі тэлефонамі, вызначаны віды захвочванняў і дысцыплінарная адказнасць вучняў. У прыватнасці, падчас заняткаў гаджэты павінны знаходзіцца ў бязгучным рэжыме ў спецыяльнай каробцы, якая ёсць у кожным класе. У перапынках паміж урокамі карыстацца мабільнымі сродкамі дазволена для аператыўнай сувязі з бацькамі і іншымі блізкімі сваякамі толькі ў выпадках вострай неабходнасці. За парушэнне гэтага правіла кіраўнік установы адукацыі можа накладаць на вучня спагнанне.

— Узаемаадносіны ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу (навучэнцаў, іх законных прадстаўнікоў, педагогаў) рэгламентуюцца ў стандарце праз вызначэнне іх правоў і абавязкаў. Стандарт у якасці ключавога права кожнага ўдзельніка адукацыйнага працэсу вызначае павагу гонару, чалавечай годнасці і правоў. Гэта адносіцца да навучэнцаў, іх законных прадстаўнікоў і педагогаў. Рэалізацыя дадзенага права, на мой погляд, магчымая толькі тады, калі кожны ўдзельнік адукацыйнага працэсу строга выконвае свае абавязкі. Абавязкі ўсіх удзельнікаў адукацыйнага працэсу вызначаны ў адпаведных раздзелах стандарту, — падкрэслівае **дырэктар Нацыянальнага інстытута адукацыі Валянціна ГІНЧУК.** — У абавязкі навучэнцам, напрыклад, ставіцца захаванне статуту ўстановы адукацыі, выкананне правіл унутранага распарадку і патрабаванняў адміністрацыі і педагогаў.

У час заняткаў навучэнцы павінны знаходзіцца ў школе, пакідаць тэрыторыю ўстановы адукацыі ў гэты час можна толькі з дазволу класнага кіраўніка або дзяжурнага адміністратара. Вучні павінны загадзя папярэдзіць класнага кіраўніка аб запланаваным наведванні арганізацыі аховы здароўя або іншай прычыне сваёй адсутнасці на ўроках. Навучэнцы абавязаны добрасумленна ставіцца да вучобы, своечасова і якасна выконваць дамашнія заданні, наведваць класныя і інфармацыйныя гадзіны, удзельнічаць у грамадска карыснай працы. Вучням забараняецца ва ўстанове адукацыі і на яе тэрыторыі курыць, выкарыстоўваць нецэнзурныя выразы, парушаць дысцыпліну падчас адукацыйнага працэсу.

Стандарт рэгламентуе правілы паводзін вучняў падчас урока, на перапынку, у сталовай, у спартыўнай зале і гардэробе. Так, напрыклад, навучэнцу трэба заняць сваё месца ў кабінеце не пазней чым за пяць хвілін да пачатку ўрока. Калі спазніўся, трэба растлумачыць педагогу прычыну. Калі пры напісанні кантрольных і самастойных работ навучэнец парушае ўстаноўленыя настаўнікам правілы, педагог мае права забраць у парушальніка работу і ацаніць толькі тую яе частку, якая была выканана ў адпаведнасці з правіламі.

Сярод абавязкаў бацькоў навучэнцаў — стварэнне неабходных умоў для паўнацэннага развіцця, выхавання, умацавання здароўя дзіцяці, падрыхтоўка іх да самастойнага жыцця ў сям'і і грамадстве. Бацькі абавязаны забяспечваць выкананне іх дзецьмі патрабаванняў установучых дакументаў і правіл унутранага распарадку для вучняў.

Што датычыцца кадравага забеспячэння, то ўстановы адукацыі павінны быць укамплектаваны кваліфікаванымі педагагічнымі работнікамі. Стандарт абавязвае ажыццяўляць павышэнне кваліфікацыі настаўнікаў не радзей як адзін раз на тры гады. Настаўнікі, у сваю чаргу, абавязаны ажыццяўляць сваю дзейнасць на прафесійным узроўні, які забяспечвае рэалізацыю адукацыйных праграм і праграм выхавання. Яны павінны захоўваць прававыя, маральныя і этычныя нормы, павышаць свой прафесійны ўзровень, праходзіць атэстацыю, прапагандаваць здаровы лад жыцця сярод вучняў. Валянціна Гінчук нагадала, што ў сваёй дзейнасці педагагічныя работнікі кіруюцца, акрамя Дзяржаўнага школьнага стандарту, Правіламі педагагічных работнікаў, якія таксама ўступілі ў дзеянне ў новым навучальным годзе.

Падрабязней азнаёміцца са зместам Дзяржаўнага школьнага стандарту можна на сайце Міністэрства адукацыі, нацыянальным адукацыйным партале і сайтах устаноў адукацыі. Стандарт абавязковы для прымянення ва ўсіх установах агульнай сярэдняй адукацыі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Навука

ПРАЗ ЭКСПЕРТЫЗУ — У ФІНАЛ

Рэкордная колькасць заявак была ададзена на рэспубліканскі конкурс інавацыйных праектаў.

«Усяго ў аргкамітэт паступіла 187 заявак: з іх 96 — на «Найлепшы інавацыйны праект» і 91 — на «Найлепшы маладзёжны інавацыйны праект». Гэта рэкордная колькасць заявак за 13 гадоў правядзення конкурсу, — падкрэслілі ў прэс-службе Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях. — Сваё жаданне паўдзельнічаць у конкурсе афіцыйна аформілі прадстаўнікі навучальных устаноў, тэхнапаркаў, цэнтраў трансферу тэхналогій, навукова-практычных цэнтраў і арганізацый. Прыём заявак завершаны».

У 2022 годзе былі аб'яўлены тры новыя дадатковыя намінацыі: «Найлепшы інавацыйны праект у сферы AgroTech», «Канструкцыя кар'ернай тэхнікі» і «Распрацоўка электронікі для цяжкіх умоў эксплуатацыі». У іх могуць прымаць удзел праекты, заяўленыя ў адной з асноўных намінацый.

Для ўсіх удзельнікаў конкурсу запланаваны семінары-трэнінгі з прыцягненнем вядучых спецыялістаў па інавацыйнай і венчурнай дзейнасці, камерцыялізацыі і бізнес-планаванні.

Цяпер праводзіцца праверка адпаведнасці прадстаўленых дакументаў умовам конкурсу, пасля чаго праекты накіруюць на экспертызу ў дзяржаўныя экспертныя саветы. Па выніках экспертызы будзе адабрана 40 праектаў-фіналістаў, аўтары якіх выступяць з прэзентацыямі на фінальным пасяджэнні савета конкурсу, якое запланавана на снежань 2022 года.

Савет конкурсу вызначыць у кожнай намінацыі аднаго пераможцу і пяць прызёраў, з іх два ўдзельнікі — якія занялі другое месца і тры — якія занялі трэцяе месца. Пераможцы атрымаюць грашовыя прызы ў памеры ад 928 да 2752 беларускіх рублёў. Пяць праектаў будуць адабраны для атрымання сродкаў на камерцыялізацыю ў памеры 18 272 беларускіх рублі.

Конкурс праводзіцца Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях пры ўдзеле Міністэрства адукацыі, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, БРСМ і Беларускага інавацыйнага фонду.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЖЫВЫЯ ФІНАНСЫ НЕ ЛЯЖАЦЬ ПАД ПАДУШКАЙ

СТАЎКІ ПА РУБЛЁВЫХ ДЭПАЗІТАХ ЯШЧЭ РАДУЮЦЬ

На ўкладах у беларускіх рублях сёння можна рэальна зарабіць: трохі раней многія нашы банкі прапаноўвалі ўражлівыя працэнтныя стаўкі гадавых. Цяпер, калі наш і расійскі рубель працягваюць умацоўвацца, некаторыя фінансавыя інстытуты нават спецыяльна зніжаюць даходнасць рублёвых укладаў. Але ўсё роўна на дадзеным этапе дэпазіты ў нацыянальнай валюце лічацца самымі выгаднымі ўкладаннямі.

Найбольш прывабны ва ўсіх адносінах уклад «Дзіцячы» ад Беларусбанка і Белінвестбанка, які прадугледжвае 16,5 % гадавых. Адзіны мінус такога ўкладу ў тым, што забраць яго мы зможам не раней чым праз 36 месяцаў (поўны тэрмін — 5 гадоў).

Зараз практычна ўсе айчынныя банкі, прапаноўваючы сваім кліентам пакласці грошы на даволі доўгія тэрміны (больш чым два гады), абяцаюць ад 15 % да 16 % гадавых. Калі вы вырашаецеся расстацца са сваімі грашыма не больш чым на год, то атрымаеце ўжо значна меншы даход — да 13 % гадавых. За карыстанне чужымі грашыма на працягу ад трох месяцаў да паўгода — ад 6 % да 10 % гадавых. Калі вы вырашылі згуляць у «кароткія» грошы (33—35 дзён), тады больш 5 % гадавых не атрымаеце.

Наогул, усе ўклады ў айчыннай валюце апошнім часам крыху страцілі сваю прыбытковасць. За апошнія тры месяцы многія банкі знізілі свае стаўкі на 4–5 %.

ЛЮДЗІ БОЛЬШ ЗДАЮЦЬ ВАЛЮТУ, ЧЫМ КУПЛЯЮЦЬ

Дзіўна, але факт: у апошнім месяцы лета ўзрасла цікавасць людзей да замежных валют. Аналітыкі лічаць, што скупка валюты ў той час, калі курс долара мінімальны, ажыццяўляецца насельніцтвам у інвестыцыйных мэтах. Але...

Пры гэтым продаж валюты нашымі людзьмі павялічыўся яшчэ больш, чым купля. Фізічныя асобы прадалі ў жніўні банкам валюты на 104,9 мільёна долараў больш, чым у ліпені. Агульная сума 923 мільёны долараў. Гэта максімальнае значэнне для гэтага

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

параметру з лютага. Рэалізацыя наяўнай валюты ўзрасла на 93,7 мільёна долараў і дасягнула 716,7 мільёна долараў. У той жа час безнаяўных долараў было прададзена больш толькі на 11,2 мільёна, на 206,3 мільёна «баксаў».

Такая структура прыросту прапановы валюты паказвае на магчымую прычыну — рэалізацыя валюты жыхарам суседніх краін, якія прыязджаюць у Беларусь па пакупкі.

У выніку фізічныя асобы ў жніўні прадалі наяўнай і безнаяўнай валюты банкам на 54,5 мільёна долараў больш, чым купілі. Гэта значыць, ужо другі месяц насельніцтва з'яўляецца чыстым прадаўцом валюты.

На гэтым фоне актыўна зніжаюцца стаўкі па ўкладах у замежнай валюце. Паводле інфармацыі сайта «Усе банкі Беларусі», у фінансавых інстытутах нашай краіны ўзнік лішак валюты, у сувязі з чым у жніўні паскорылася зніжэнне працэнтаў па валютных укладах насельніцтва і прадпрыемстваў, якое можа перарасці ў абвальнае падзенне да нуля.

Крэдытаванне ў доларах і еўра ў Беларусі становіцца ўсё менш папулярным з-за рызыкі ўвядзення санкцый з боку заходніх краін, таму патрэбы банкаў у гэтых валютах скарачаюцца, і яны ўсё хутчэй зніжаюць працэнты па дэпазітах.

Так, паводле даных Нацыянальнага банка, сярэдняя стаўка па новых валютных укладах фізічных асоб у доларах ЗША на тэрмін да года ў жніўні апусціўся да 4,73 % гадавых з 5,26 % у ліпені, а па ўкладах на тэрмін вышэй чым год — да 6,1 % з 6,33 %.

На практыцы ў банках сярэднія стаўкі па валютных дэпазітах дасягаюць усяго 4–6 %. Яшчэ больш істотна знізіліся сярэднія стаўкі па новых доларавых дэпазітах юрыдычных асоб.

Стаўкі па ўкладах у еўра для фізічных асоб таксама хутка зніжаюцца і застаюцца крыху меншыя, чым па доларавых. Сярэдняя стаўка па новых дэпазітах насельніцтва ў еўрапейскай валюце на тэрмін да года ў жніўні склала 4,33 % гадавых супраць 4,94 % у ліпені, а па доўгатэрміновых укладах — 5,87 % супраць 6,15 %.

Працягваецца хуткае зніжэнне працэнтаў па дэпазітах у расійскіх рублях. У прыватнасці, сярэдняя стаўка па новых укладах фізічных асоб на тэрмін да года апусцілася ў жніўні да 10,48 % з 12,65 % у ліпені. Па доўгатэрміновых укладах у расійскіх рублях стаўка паменшылася да 11, 56 % з 13,76 %.

КРЭДЫТАВАННЕ СТАНОВІЦЦА БОЛЬШ ДАСТУПНЫМ

Зніжэнне ставак па дэпазітах не суправаджаецца адпаведным памяншэннем працэнтаў па крэдытах, лічаць аналітыкі фінансавага партала. Напрыклад, сярэдняя стаўка па новых крэдытах фізічным асобам у беларускіх рублях на тэрмін да года ў жніўні апусцілася, але нязначна — да 12,52 % з 12,85 % у ліпені. Па доўгатэрміновых крэдытах аналагічная стаўка склала 13,81 % супраць 14,32 %.

Стаўкі па крэдытах Белінвестбанка «Асабісты выбар» і «Зручны» апусціліся на 1 % да 19,9 % гадавых, а па крэдыце «Прафесійны» — на 1 % да 18,9 % гадавых. Для крэдытаў «На фінансаванне нерухомасці (у тым ліку жылыя дамы)» і «ТрэйдІн на нерухомасць» ад гэтага банка стаўкі сталі меншыя на 1,4 % і дасягнулі 19,5 % гадавых. Такім жа чынам змяніліся максімальныя стаўкі па крэдытах «Нерухомасць ад партнёра».

Таксама па новых умовах для крэдытнай карткі «Заўсёды пад рукой» стаўкі на карыстанне сродкамі на тэрмін да 90 і 180 дзён знізіліся на 3 % — да 14,9 % і 16,9 % гадавых адпаведна; пры гэтым стаўка на тэрмін звыш 181 дня скарацілася на 1 % — да 19,9 % гадавых.

У сваю чаргу, прэс-служба «Беларусбанка» заявіла аб тым, што прынята рашэнне з 26 верасня палепшыць умовы для сваіх спажыўцоў, якія ўжо карыстаюцца крэдытнымі прадуктамі банка на будаўніцтва і куплю нерухомасці з плавальнымі стаўкамі — іх скароцяць да 19,5 % гадавых.

«Улічваючы надыходзячы юбілей банка, мы прынялі рашэнне аб зніжэнні ставак, якія перавышаюць 19,5 %, па раней выдадзеных крэдытах на нерухомасць. Гэта дазволіць многім кліентам знізіць фінансавую нагрузку на сямейны бюджэт», — адзначыла **намеснік старшыні праўлення Беларусбанка Святлана КАЖЭКІНА**.

Новаўвядзенне закране крэдыты, якія аформлены сёлета з 1 чэрвеня да 28 жніўня. Пры гэтым па тых дагаворах, якія былі заключаны да 31 мая, як паведамляецца, «да канца бягучага года стаўка складзе 19,5 % гадавых».

БУМ У СФЕРЫ СПАЖЫВЕЦКАГА ЛІЗІНГУ

У першым паўгоддзі колькасць дагавораў, заключаных беларускімі лізінгавымі кампаніямі (без уліку банкаў) з фізічнымі асобамі, павялічылася на 26,9 % і дасягнула 79,5 тысячы. У Асацыяцыі лізінгадаўцаў падкрэслілі, што рост колькасці дагавораў у сферы спажывецкага лізінгу абумоўлены павелічэннем попыту з боку насельніцтва на фоне менш лаяльных умоў фінансавання ў рамках спажывецкага крэдытавання. Гэта значыць, лізінгавыя кампаніі скарысталіся некаторай паўзай у росце спажывецкага крэдытавання. Усяго, па даных на 1 ліпеня бягучага года, у рэестр лізінгавых арганізацый Нацыянальнага банка быў уключаны 101 суб'ект гаспадарання. Сукупны аб'ём партфеля лізінгавых арганізацый на гэтую дату склаў 7,68 мільярда рублёў, павялічыўшыся за паўгоддзе на 293,76 мільёна рублёў.

Эксперты адзначаюць, што пры гэтым значна зменшылася колькасць прадметаў, якія перадаюцца ў лізінг, за выключэннем бытавой тэхнікі і электронікі, якія набываліся насельніцтвам. А менавіта будынкаў і збудаванняў у першым паўгоддзі было прададзена фізічным і юрыдычным асобам усяго 80 супраць 228 ха такі ж час летась.

Колькасць прададзеных у лізінг адзінак машын і абсталявання знізілася да 8 736 з 10 884 адпаведна. У той жа час кліенты актыўна бралі ў лізінг не толькі бытавую тэхніку і электроніку, але і больш дарагія аб'екты.

ДЗЕ АФОРМІЦЬ БЯСПЛАТНЫ «ПЛАСТЫК»

Калі картка неабходная для разлікаў у крамах, аплат у АРІП, пераводаў з карты на карту і іншых базавых патрэб, то не ўсе хочуць марнаваць шмат грошай на яе выпуск. Мы высветлілі, у якіх банках ёсць такі «кашалёк» з нулявой камісіяй — калі не бяруць грошы ні за выпуск, ні за абслугоўванне. Ёсць нават варыянты з невялікім кэшбэкам і зніжкамі.

Цяпер цалкам бясплатных картак з фізічным носьбітам у беларускіх банках не так шмат. Па-першае, гэта пенсіённая картка Беларусбанка БЕЛКАРТ-прэміум у рамках клуба «Аксаміт». Кешбэк 1 % за плацяжы ў АРІП і 3 % у асобных катэгорыях. Можна здымаць да 200 рублёў у месяц у любых беларускіх банкаматах без камісіі. Прадугледжана зніжка 15 % пры афармленні поліса страхавання. Таксама можна выпусціць бясплатна картку БЕЛКАРТ-прэміум пры афармленні яе да рахунку з базавымі ўмовамі абслугоўвання ў якасці адзінай дзеючай карткі.

У банку БелВЭБ можна выпусціць дзве карты: БЕЛКАРТ-прэміум або Visa Classic у рамках пакета паслуг «Усё проста». Афармляюцца бясплатна толькі ў офісах банка. Разлічвацца можна толькі на тэрыторыі Беларусі (Visa Classic) і беларускіх сайтах і ў сетцы аплатнай сістэмы «Мір» (БЕЛКАРТ-прэміум), у тым ліку пры адсутнасці іншых дзейных картак БЕЛКАРТ-прэміум, БЕЛКАРТ-стандарт.

У банку «Дабрабыт» бясплатнай будзе картка Visa Gold у рамках пакета паслуг «Матуля». Яна прадугледжвае кэшбэк да 2 % і зніжкі да 50 % у партнёраў (сярод іх — крамы «Світанак», 21vek.by, медцэнтр «Ладэ», лабараторыя «Сінэва» і іншыя). Разлічвацца можна толькі на тэрыторыі Беларусі і беларускіх сайтах.

У МТБанку можна заказаць бясплатную картку Mastercard Standard «Кактус». Кэшбэк ад любых пакупак да 1 % у бонусных балах, з дапамогай якіх у далейшым можна кампенсаваць свае пакупкі. Яе можна афармліць як віртуальную, так і з фізічным носьбітам (у офісе банка).

У Парытэтбанку часова даступная бясплатная картка Mastercard Gold. Бясплатна афармліць картку можна толькі ў офісе ў Мінску. Падыходзіць для разлікаў як у Беларусі, так і за мяжой.

Тэрмін дзеяння гэтых картак ад 3 да 7 гадоў. Акрамя таго, банкі прапануюць бясплатныя карты без фізічнага носьбіта, ёсць віртуальныя (лічбавыя). Іх можна афармліць у некалькі клікаў у дадатку і выкарыстоўваць для разлікаў на сайтах або ў афлайн-крамах (з дапамогай тэлефона ці смарт-гадзінніка). Віртуальныя карткі без платы за выпуск і абслугоўванне можна афармліць амаль ва ўсіх банках краіны.

Сяргей КУРКАЧ.

Надвор'е

«РЭПЕТЫЦЫЯ» БАБІНАГА ЛЕТА

У пятніцу і суботу чакаецца больш за 20 градусаў цяпла

Трэція выхадныя верасня ў нашай краіне аказаліся халаднаватымі. Сярэдняя тэмпература паветра была на 1—4 градусы ніжэйшая за кліматычную норму. А на гэтым тыдні намячаецца тэндэнцыя да пацяплення, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Чакаецца, што ў пачатку тыдня з паўднёвымі патокамі ў Беларусь будуць паступаць даволі цёплыя паветраныя масы, так што дзённая тэмпература паветра павысіцца да 11—17 градусаў. Паводле слоў сіноптыкаў, у другой палове тыдня пераважна ў паўднёвых і паўднёва-ўсходніх раёнах Беларусі паветра ў сярэдзіне дня будзе прагравацца да 18—21 градуса. Толькі ў асобныя дні пры больш шчыльнай воблачнасці і дажджах месцамі па краіне максімумы не перавысяць плюс 9—10 градусаў. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах будзе згушчацца туман.

Сёння, пераважна па паўднёва-ўсходняй частцы краіны, пройдуць кароткачасовыя дажджы. Максімальная тэмпература паветра днём складзе 11—17 градусаў цяпла. У сераду будзе дажджліва і холадна. У гэты дзень на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 4—11 градусаў, а ўдзень — плюс 9—16 градусаў.

Пачынаючы з чацвярга чакаем «рэпетыцыю» бабінага лета. У гэтыя суткі на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах магчымы слабы туман. Ноччу тэмпература паветра панізіцца да плюс 4—10 градусаў. Днём паветра прагрэецца да 11—16 градусаў, а па поўдні — да 18 градусаў.

У пятніцу на большай частцы тэрыторыі Беларусі зноў прагназуюцца дажджы. Гэтым разам яны будуць выключна грыбныя, паколькі начная тэмпература паветра месцамі будзе больш за 10 градусаў. Уначы і раніцай у асобных раёнах туман. Тэмпература паветра ноччу будзе вагацца ад плюс 5 градусаў да 12 цяпла. Максімальная тэмпература днём складзе плюс 12—18 градусаў. Па поўдні краіны паветра прагрэецца да 20 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у першы дзень кастрычніка ў многіх раёнах краіны пройдуць дажджы. У начныя і ранішнія гадзіны месцамі магчымы туман. Ноччу тэмпература паветра будзе вагацца ад плюс 5 градусаў па поўначы да 14 градусаў па поўдні краіны. Удзень чакаецца ад плюс 11 градусаў у паўночных раёнах краіны да 21 цяпла ў паўднёва-ўсходніх рэгіёнах.

Сяргей КУРКАЧ.

НОВАЕ ЗОЛАТА МІНШЧЫНЫ

Мінскі абласны фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі адбыўся ў мінулую суботу ў Стоўбцах

Працаўнікі хлебнай нівы Міншчыны сустрэлі свята важкім караваем. Сярэдняя ўраджайнасць па вобласці на ўзроўні 44 цэнтнераў з гектара. У лідарах Слуцкі, Мінскі і Капыльскі раёны, якія адпаведна намалацілі 161 737 тон, 153 303 тоны і 146 350 тон. Высокай ураджайнасцю парадавалі Нясвіжскі раён — 71 цэнтнер з гектара, Дзяржынскі раён — 65 цэнтнераў з гектара і Клецкі — 62 цэнтнеры з гектара. Па 1000 тон збожжа намалацілі 908 камбайнавых экіпажаў, 173 — па 2000, 27 — па 3000 тон. Пабіў усе рэкорды экіпаж камбайна Сяргея Максімца і Васіля Зура з адкрытага акцыянернага таварыства «Крутагор'е-Петкавічы». На іх рахунку шэсць тысяч тон збожжа, прычым працавалі хлопцы на камбайне айчыннай вытворчасці.

Фота БелТА.

Работнікаў аграпрамысловага комплексу Міншчыны, пераможцаў абласнога спаборніцтва на ўборцы ўраджаю 2022 года павіншаваў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка: «Вам ёсць чым ганарыцца. На Міншчыне сабрана звыш двух мільёнаў тон збожжа. Гэта больш як чвэрць рэспубліканскага караваю. За гэтымі лічбамі стаіць карпатлівая праца камбайнераў, кіроўцаў, селекцыянераў, вучоных і кіраўнікоў гаспадарак. Сёлетні год стаў сапраўдным выпрабаваннем для хлебаробаў краіны. Вам давялося змагацца літаральна за кожны вырашчаны колас. У той сітуацыі, што склалася ў свеце, збожжавыя культуры сталі новым золатам, якое гарантуе дзяржаве харчовую бяспеку і стабільнасць. Дзякуй за вашу нялёгкую працу практычна без выхадных і святочных дзён, шчырую любоў да роднай зямлі, якую вы перадаяце сваім дзецям і моладзі. Моцнага вам здароўя, сямейнага дабрабыту, поспехаў і новых дасягненняў на працоўнай ніве».

Прывітальны адрас зачытаў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Максім Рыжанкоў. Акрамя таго, ён уручыў карзіну з кветкамі ад кіраўніка дзяржавы ўсім аграрыям Мінскай вобласці. Букет прыняў старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр Турчын. Максім Рыжанкоў таксама ўручыў ганаровыя граматы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь старшыні Смалявіцкага райвыканкама Андрэю Ратомскаму, дырэктару філіяла «Астрашыцкі Гарадок» ААТ «Першая Мінская птушкафабрыка» Аляксандру Юргевічу. Падзякай кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь адзначаны старшыня Крупскага райвыканкама Анатоль Козел, дырэктар філіяла «Фалько-Агра» агракамбіната «Дзяржынскі» Вадзім Кунц, дырэктар ААТ «Нарачанскія зоры» Вілейскага раёна Генадзь Кучко.

Падзякаваў за добрую работу хлебаробам і **старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН.**

— Многія думаюць, што гэты год для аграрыяў быў спрыяльны. Своечасова пасеялі, без страт сабралі ўраджай. І яны маюць рацыю. Але такіх вынікаў нельга дабіцца, разлічваючы толькі на прыроду і каляндар. У аснове поспеху — разумны менеджмент і тэхналогіі. На старце пасяўной кампаніі толькі на набыццё ўгнаенняў было накіравана больш як 90 мільёнаў рублёў. Не толькі з абласнога бюджэту, аграрыі вобласці атрымалі значную падтрымку ўсёй краіны, — падкрэсліў Аляксандр Турчын. — Асаблівую ўдзячнасць хачу выказаць Прэзідэнту Беларусі за яго бацькоўскую ўвагу і падтрымку сельскіх працаўнікоў. Дзякуючы рашэнням кіраўніка дзяржавы і магчымасцям вобласці за паўтара года мы змаглі пабудаваць 28 сучасных айчынных зернекомплексаў, за апошнія тры гады мы паставілі ў гаспадаркі больш за 300 энерганасычаных трактароў, 260 збожжаўборачных камбайнаў, сотні адзінак абсталявання і механізмаў. Сукупны аб'ём фінансавання для абнаўлення машыннага парка склаў больш як 240 мільёнаў рублёў.

Аднак, як адзначыў Аляксандр Турчын, колькі б сродкаў ні ўкладвалі, якую б тэхніку ні пастаўлялі, галоўным застаецца чалавек. Ад яго і толькі ад яго залежыць, ці будзе з хлебам краіна. Гэта асабліва актуальна цяпер, калі першараднае значэнне ва ўсім свеце набывае хлеб. «У двух мільёнах тон сабрана каласальная праца ўсіх спецыялістаў-хлебаробаў. Вынік вашай працы непасрэдна ўплывае на эфектыўнасць іншых сфер эканомікі — жывёлагадоўлю, перапрацоўку, забеспячэнне ўнутранага рынку прадуктамі харчавання, пастаўкі харчавання на экспарт і іншае», — сказаў старшыня мінаблвыканкама.

Аляксандр Турчын уручыў узнагароды не толькі камбайнерам і кіроўцам, што непасрэдна ўдзельнічалі ў жніве, але і спецыялістам, жывёлаводам, паляводам. Адзначыў ён і сямейныя дынастыі, якіх у аграрным сектары Міншчыны даволі шмат. Напрыклад, заснавальнікам дынастыі Германовічаў з ААТ «Гарадзяцічы-Агра» з'яўляюцца тры браты — Іван, Мікалай і Яўген. Любоў да зямлі, працавітасць і адданасць справе яны перадалі сваім сынам, якія працягваюць сямейныя традыцыі.

Яркая і захапляльная была і праграма свята, багатая на мерапрыемствы, разлічаная на людзей розных узростаў і густаў. Для жыхароў раёна і гасцей працавалі тэматычныя пляцоўкі, інтэрактыўныя зоны, фотазоны, конкурсы, літаратурнае кафэ. У парку Дружбы народаў разгарнуліся гандлёвыя рады, кірмаш-продаж «Дары Міншчыны». Тут можна было смачна паесці, прыкупіць смакаты дахаты, набыць вырабы народных умельцаў.

Шмат дарослых і дзяцей сабралі паказальныя выступленні супрацоўнікаў абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях на гарадскім возеры. Дно вадаёма і яго берагі на працягу года ачысцілі ад смецця, добраўпарадкавалі, зрабілі пешаходныя масты. На набярэжнай № 2 паклалі плітку, правялі асвятленне, уладкавалі малыя архітэктурныя формы.

Вельмі відовішчнымі былі спаборніцтвы на спартыўных машынах па новай аб'язной дарозе. Яшчэ адна значная падзея свята — адкрыццё кінатэатра «Беларусь». Аляксандр Турчын і Максім Рыжанкоў перарэзалі сімвалічную стужку, пасля чаго для іх і ўсіх ахвотных правялі экскурсію па шматфункцыянальным культурным комплексе. З такой нагоды старшыня Мінаблвыкама выказаў сваё меркаванне наконт падрыхтоўкі Стоўбцаў да «Дажынак»:

— Місія прымаць абласныя «Дажынкі» для горада пачэсная і важная. На прыкладзе Стоўбцаў мы бачым, што няма мяжы дасканаласці. Кінатэатр дастаткова ўнікальны. Хацелася б, каб ён стаў цэнтрам прыцягнення мясцовай моладзі і не толькі. Апошнім часам шмат зрабілі для паляпшэння інжынернай, транспартнай структуры Стоўбцаў. Летась увялі ў эксплуатацыю новую школу, аб'язную дарогу, зону адпачынку, уладкавалі камп'ютарны тамограф у медыцынскай установе. На мой погляд, гэтага павінна быць дастаткова для камфортнага жыцця людзей. Такое неабходна зрабіць у кожным раённым цэнтры. І якасць жыцця павінна быць там не горшая, чым у сталіцы.

У канцы свята перад гледачамі выступілі з канцэртам зоркі беларускай эстрады: Ганна Трубяцкая, Яўген Курчыч і група «Статус», група PALLADIUM, заслужаныя артысты Рэспублікі Беларусь Вікторыя Алешка, Жанет, арт-група «Беларусы», Беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры». Парадаваў прысутных і артыст расійскай эстрады Стас П'еха.

Пасля канцэрта неба над горадам расквецілі феерверк.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

МЁРСКІ СМАК

Мёры, што ў Віцебскай вобласці, носяць ганаровае званне журавінавай сталіцы Беларусі невыпадкова: менавіта на Мёршчыне размяшчаецца балота Ельня, дзе знаходзяцца самыя вялікія ў краіне запасы гэтых ягад. А тутэйшыя жыхары ператварылі лясное багацце ў своеасаблівы брэнд і ладзяць экалагічнае свята «Жураўлі і журавіны Мёрскага краю».

Сёлета ягадны ўраджай меншы за леташні з-за халоднай вясны і засушлівага лета, аднак руплівыя гаспадары ўсё ж сабралі ў засекі гэты багаты на вітаміны прыродны прадукт. Сёлета ў межах фестывалю праводзілі нават конкурс на найлепшага здатчыка журавін.

З 19 да 25 верасня ў раёне прайшоў экалагічны тыдзень ва ўстановах адукацыі. Школьнікі бралі ўдзел у тэматычных гульнях і квэстах, здзяйснялі экавандроўкі і былі ўдзельнікамі прыродаахоўных акцый. А яшчэ прадстаўлялі свой палёт фантазіі на школьных выставах — кампазіцыі з асенніх кветак, вырабы з садавіны і агародніны.

20 верасня на Мёршчыне прайшоў конкурс сярод прафсаюзных арганізацый працоўных калектываў па зборы ягад «Смак журавін», у якім удзельнічалі 10 камандаў. Па выніках нялёгкай і ўпартай барацьбы першае месца заняла каманда ясляў-сада № 2 Мёраў, на другім месцы размясціліся работнікі раённай бальніцы, а «бронзу» заваявалі прадстаўнікі сектара спорту і турызму райвыканкама.

Знайшлося ў межах фестывальнага тыдня і месца для аматараў хуткасці, руля і чатырох колаў — раённы конкурс «Жураўліны драйв» сабраў прадстаўнікоў розных арганізацый, якія спаборнічалі ў веданні правілаў дарожнага руху і віртуозным кіраванні аўтамабілем.

Напярэдадні свята па добрай традыцыі прайшло пасяджэнне клуба маладой сям'і «Жураўлінай сцяжынай», у межах яго бацькі разам з дзеткамі наведалі экалагічную сцежку на балоце Ельня і паназіралі за крылатымі прадстаўнікамі навакольнага свету.

У суботу па цэнтральнай вуліцы прайшло ўрачыстае шэсце працаўнікоў вёскі, якія паказалі высокія вынікі ва ўборачнай кампаніі — 2022; арганізацый і ўстаноў раёна; творчых калектываў. У гарадскім парку «Паўвостраў» стартаваў абласны конкурс вырабаў народных майстроў «Птушыны перапалох» з правядзеннем майстар-класаў для ўсіх жадаючых.

Галоўным момантам экафестывалю стаў абласны конкурс ансамбляў песні і музыкі «Жураўліны звон», які сабраў 15 найлепшых калектываў народнай творчасці паўночнага рэгіёна. Дарэчы, гаспадары свята — ансамбль музыкі і песні «Мёрыца» мясцовай дзіцячай школы мастацтваў заняў пачэснае другое месца ў вакальным спаборніцтве, а «золата» дадому прывезлі артысты калектыву «Відзаўчанка» з Браслаўшчыны.

Гасціннасцю ўражвалі падворкі сельсаветаў і аграсядзіб: на «Язненскім» частавалі гасцей бульбай і хатнім хлебам, на «Мёрскім» — вэнджаным мясам, а ААТ «Туркова» прапаноўвала духмяную юшку. І, вядома, немагчыма было злічыць страў з журавін. Рупліваыя гаспадары прапаноўвалі набыць мёд з асабістых гаспадарак і сыры дамашняй вытворчасці.

Экафестываль — яшчэ і тое месца, дзе традыцыйна падводзяць вынікі раённага конкурсу па добраўпарадкаванні тэрыторый прадпрыемстваў, населеных пунктаў, двароў. Пералічыць усіх узнагароджаных немагчыма, сярод прадпрыемстваў найлепшай была прызнана тэрыторыя мясакамбіната і ААТ «Туркова», статус «Дамоў узорнага парадку» атрымалі 20 сядзіб.

Удзельнікі свята маглі адправіць тэматычныя паштоўкі на «Жураўлінай пошце», праспявалі гімн Ельні разам, праявілі сілы на спартыўна-забаўляльнай пляцоўцы «Журавель-асілак». А галоўнае, уволю наеліся сакавітых журавін і кулінарных прысмакаў з ягад, некаторыя — назапасілі на наступны год не толькі дары прыроды, але і бадзёры настрой.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.

І пайшлі брат з сястрою па навакольных вёсках. Прытулак знайшлі ў Жыціні ў сваякоў, якія клапаціліся па сірот, як пра сваіх дзетак: і кармілі добра, і да работы прывучалі, пакуль тыя падраслі і пайшлі ў людзі. Колькі жыла Марыя Пасюк, для яе 11 верасня заставалася чорнай датай. Помніў той Галавасек і муж, Васіль Ігнатавіч. Ён падлеткам бег да Драмлёва на пажар, ды немец з кулямётам не падпусціў блізка.

А БЭЗ УСЁ ЦВІЦЕ

Праз два дні, 13 верасня, надышла нядзеля. Але зусім не святочным выдаўся той дзень. Немцы знялі ачапленне, дазволілі пахаваць забітых. Жыхары навакольных вёсак прыйшлі на папялішча. Людзі рукамі, віламі грузілі на пажарышчы абгарэлыя целы і везлі вазамі на могілкі ў Сцяпанкі. Сярод гэтых далакопаў быў і сарагадвухгадовы драмлёвец Павел Ляўчук. Ён застаўся жывым, бо ў трагічны дзень адсутнічаў у сваёй гаротнай вёсцы. Як апантаны, ён рыў гарачы попел, пакуль не адшукаў кавалак знаёмай тканіны. Прыклаў яго апаленымі далонямі да твару і заплакаў. Тут ляжалі, ператвораныя ў прах, яго родныя жанчыны: жонка Аня і дочкі Ніна, Ліда, Жэня. Старэйшай было чатыры гады, малодшай — дзесяць месяцаў...

Пра тую жудасную нядзелю ўспамінала і Вера Кірылюк: *«Калі ўсё пагарэла, я з татам і мамай Таццянай рушылі туды. Мужыкі збіралі на фуры целы і везлі іх на клады ў Сцяпанкі. Вялікую, вельмі вялікую яміну выкапалі, туды клалі. Былі сярод людзей такія, што пазнаеш, былі і тыя, каго пазнаць было немагчыма... Картоплі вялі выбіралі — усё на вазах засталося, куры бегалі пераляканыя. Яшчэ мая матуля дала бабулі (сваёй, значыцца, маме) куранятак, і тыя гойсалі каля згарэлай хаты. Стаялі, плакалі мы ўсе. А што ж яшчэ зрабіць маглі?*

З таго часу мінула ўжо восемдзесят гадоў. Некалі кожную вясну пад акном Антанюковай мазанкі распускаўся бэз. 11 верасня згараслі людзі, хаты, дрэвы і толькі кустоўе нейкім чынам не крануў агонь. Хоць больш правільна сказаць — крануў, ды не да смерці. Колькі часу прайшло, колькі дзесяцігоддзяў, а бэз усё цвіце. Так і цягнецца, так і цягнецца ён увысь. Бабулечка мая згарэла, цёткі Аня, Лёша, Тоня і Людка малая згарэлі. На могілках, на тумбачцы гэтай каля помніка, мае ўсе напісаны...»

ЗАРУЧАНЫЯ З ПАМЯЦЦЮ

Мінулі дзесяцігоддзі, змяніліся пакаленні. Здаецца, пара супакоіцца, аднак попел Драмлёва ўсё не астывае. І кожны раз вясной і восенню, калі плугі ўзнімаюць глебу на месцы, дзе калісьці чатыры стагоддзі стаяла вёска, на паверхню выходзяць усё новыя сведчанні таго, што адбылося на той Галавасек. Кожны артэфакт можна разглядаць бясконца, разважаючы аб трагічным лёсе ўласнікаў гэтых рэчаў. І пры гэтым уяўляць маштаб таго, што адбывалася 11 верасня. Найперш ураважаюць россыпы адстраляных гільзаў і патронаў, на якія і праз восемдзесят гадоў багатая драмлёўская зямля. Трапляюцца шмат шкла, пратвораванага агнём у нейкія пачварныя «істоты». Дзволі шмат абпаленай цэглы і камянёў, металічных частак ад пабудоў і нарэшце, гузікаў ды іншай драбязы, што дазваляе ўявіць, якім было жыццё драмлёўцаў.

Асаблівыя адчуванні выклікае нацельны крыж. Драмлёўцы ў большасці сваёй былі праваслаўнымі. Адзінае выключэнне складала сям'я Андрэя Цэсліка, які пасяліўся ў вёсцы з 1926 года. Сам па вераваснанні каталік, Андрэй Лукіч і сваіх дзяцей хрысціў у касцёле. Прынесла драмлёўская зямля і тры медныя заручальныя прэсцёнкі (адзіны мужчынскі і два жаночыя), выраблены, магчыма, тутэйшым кавалём. Калі трымаеш у руцэ маленькую белую пацерку ці шкляны корак ад бутэлечкі з-пад парфумы, якімі карысталася восем дзясяткаў гадоў таму нейкая кабета ці дзяўчына, міжволі сціскаецца сэрца.

...Драмлёўцы жылі, не чакалі бяды. Не чакалі яе да таго ранку, пакуль у вёску не наляцелі драпежнікі. Якім ніколі не павінна быць ні апраўданне, ні дараванне.

Анатоль БЕНЗЯРУК,
фота аўтара і з яго архіва.

Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпавednасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.

«УЗНАЮЦЬ ГЭТА ЎСЁ ПАТОМКІ ПРАЗ ПАПЕРУ!»

(100 гадоў архіўнай службе Беларусі)

Пры судакрананні з паняццямі «архіў», «справа», «дакумент» натуры паэтычнай абавязкова прыйдуць на памяць радкі верша Максіма Багдановіча «Летапісец»:

Што тут чынілася ў даўныя гады,
Што думалі, аб чым спрачаліся тады,
За што змагаліся, як баранілі веру, —
Узнаюць гэта ўсё патомкі праз паперу!
Яно забудзецца, умрэ, з вадой сплыве, -
І вось у споміне устане, ажыве,
Калі знайдуць яго няхітрае пісанне
Пра гэтае жыццё, надзеі, справаванне.

Паэт, несумненна, быў захоплены таямніцамі мінуўшчыны, і ў працы старажытнага летапісца бачыў вялікую гістарычную місію. Ды не толькі захапленне кіравала ім. Паэт, думаю, заклікаў шанаваць памяць аб мінулым, берагчы тое «няхітрае пісанне», праз якое дойдуць да будучыні «жыццё, надзеі, справаванне» ў праўдзівых дэталях і вобразах.

ДЛЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА» І НЕ ТОЛЬКІ

Гэтымі днямі ў многіх публікацыях, на канферэнцыях, на адкрыцці выстаў, у студэнцкіх аўдыторыях згадваецца 100-гадовы юбілей дзяржаўнай архіўнай службы Беларусі. На старонках газеты «Звязда» нярэдка з'яўляюцца артыкулы, падрыхтаваныя на падставе архіўных дакументаў з падборкамі да іх ілюстрацый і з пазначэннем месца захоўвання «Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва». У гэтыя юбілейныя дні наспела нагода згадаць пра гэтую ўстанову, з рарытэтамі якой так часта сустракаецца чытач.

За шэсцьдзясят два гады сваёй дзейнасці архіў-музей прыняў у свае сховішчы больш за пяцьсот дваццаць архіўных фондаў па гісторыі літаратуры і мастацтва. Сярод іх фонды класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы, Якуба Коласа, Язэпа Пушчы, Адама Бабарэкі, Максіма Танка, Аркадзя Куляшова, Пімена Панчанкі, Янкі Брыля, Уладзіміра Дубоўкі, Івана Мележа, Івана Шамякіна, Міхася Лынькова, Канстанцыі Буйло, Васіля Быкава, Рыгора Барадуліна, Генадзя Бураўкіна, Ніла Гілевіча і многіх іншых; акцёраў — народных артыстаў СССР і Беларусі Галіны Макаравай, Стэфаніі Станюты, Фёдара Шмакава, Аляксандры Клімавай, Уладзіміра Уладамірскага, Леаніда Рахленкі, Лідзіі Ржэцкай; кампазітараў Юрыя Семянкі, Яўгена Глебава, Пятра Падкавырава, Яна Тарасевіча, Анатоля Багатырова; мастакоў Аркадзя Астаповіча, Валянціна Волкава, Арлена Кашкурэвіча, Барыса Малкіна, кінарэжысёраў Уладзіміра Корш-Сабліна, Віктара Турава, Віталя Чацверыкова і многіх іншых.

ПЕРШЫЯ КРОКІ

Гісторыя архіва-музея пачалася 9 чэрвеня 1960 года. Менавіта ў гэты дзень была падпісана пастанова Савета Міністраў БССР аб стварэнні Цэнтральнага дзяржаўнага архіва літаратуры і мастацтва БССР. На дзень стварэння архіва многія фонды творчых устаноў захоўваліся ў Цэнтральным дзяржаўным архіве Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва (сучасны Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь). У хуткім часе гэтыя фонды былі перададзены новастворанаму профільнаму архіву. Некаторыя з перададзеных фондаў захаваліся з даваенных часоў, як, напрыклад, фонд літаратурнай арганізацыі «Маладняк», «Белдрамтаварыства», Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра. А вось асабістыя архіўныя фонды на той час заставаліся па-за ўвагай практычнай дзейнасці дзяржаўных архіваў Беларусі. Да стварэння архіва літаратуры і мастацтва архівы асабістага паходжання, і найперш дзеячаў літаратуры і мастацтва, не з'яўляліся абавязковым аб'ектам іх камплектавання. Гэтую работу, пры нагодзе, ажыццяўлялі музеі — для папаўнення сваіх экспазіцый — і бібліятэкі.

Некалькі радкоў пра дакументы архіва-музея, якія сведчаць пра далёкае дзевятнаццатае стагоддзе. Згадаю самы ранні арыгінальны дакумент, які мае ўсе падставы называцца ўнікальным: запісную кніжку сям'і мастака і пісьменніка Каруся Каганца — Казіміра Кастравіцкага. Кніжка спачатку належала дзеду пісьменніка Самуілу Кастравіцкаму, а пасля бацьку, удзельніку паўстання 1863 г. Карлу Кастравіцкаму, першы запіс у ёй зроблены ў 1813 г. За вокладкай гэтай кніжкі больш за сто пяцьдзясят гадоў захоўваліся развітальныя аўтографы асуджаных на высылку сукамернікаў Карла Кастравіцкага, вядомых кіраўнікоў паўстання на Міншчыне.

Да ўнікальных варта аднесці і фонд Грыгаровіча. Ён, акрамя таго што захоўвае рукапіс невыдадзенага другога выпуску «Беларускага архіва», падрыхтаванага Грыгаровічам у 1825 годзе, мае копіі дакументаў па гісторыі Беларусі ад 1240 года. Арыгіналы гэтых дакументаў, на вялікі жаль, не захаваліся, і копіі, зробленыя два стагоддзі таму, з'яўляюцца бясспрэчнымі сведкамі іх існавання.

Хочацца згадаць і рукапісную «Беларускую хрэстаматыю» 1889 года, якую «сабраў і ўпарадкаваў Браніслаў Эпімах-Шыпіла», дзякуючы якой у беларускай літаратуры захаваліся імёны і ўзоры паэтычных твораў нашых даўніх часоў.



Я. Купала. «Над ракой Арэсай». Паэма. Замест уступу. Аўтограф. 1933 год.

СТРАЧАНАЕ І ЗАХАВАНАЕ

Многія выдатныя людзі мінулага з вялікай увагай ставіліся да дакументальных крыніц, збіралі і захоўвалі іх, стваралі ўнікальныя калекцыі і цэлыя музеі. У іх шэрагу вялікія беларусы Іван Грыгаровіч, Аляксандр Ельскі, Браніслаў Эпімах-Шыпіла, браты Іван і Антон Луцкевічы, Рамуальд Зямкевіч і іншыя, чые зборы былі вядомыя далёка за межамі іх прыватных уладанняў. На вялікі жаль, час не быў літасцівы да гэтых унікальных калекцый: некаторыя страчаны цалкам, некаторыя дайшлі да нас толькі невялікімі фрагментамі. Але яны залажылі практыку збірання перш за ўсё асабістых архіваў, зрабілі першыя крокі да методыкі іх сістэматызацыі і апісання і стварылі перадумовы для арганізацыі іх камплектавання ў дзяржаўных архівах у будучым.



Нататнік бацькі К. Каганца К. К. Кастравіцкага з гаспадарчымі запісамі і аўтографамі паўстанцаў 1863—1864 гадоў: Міхала Радзевіча, Адама Вайцяхоўскага, Міхала Дабравольскага, Баляслава Баравіка, Цэзара Міцкевіча і іншых.

Б. Малкін. «Жоўты клоўн». Серыя «Цырк. Клоўны». Манатыпія. 1966–1968 гады.

Найбольш стратным для Беларусі ў дачыненні да архіўных крыніц стала XIX стагоддзе. Мы да гэтай пары ў пошуках нашых скарбаў, адпраўляемся ў іншыя краіны, каб выявіць рукапісы і дакументы Багушэвіча, Дуніна-Марцінкевіча, Янкі Лучыны і іншых. Пры гэтым я маю на ўвазе не толькі архівістаў, але і даследчыкаў-літаратуразнаўцаў. У многіх выпадках надараецца шанец атрымаць копіі. Даследчыкі пакідаюць іх у сваіх асабістых зборах, архівісты ствараюць калекцыі. З такой калекцыяй можна пазнаёміцца і ў архіве-музеі. Яе складаюць дакументы і рукапісы Адама Міцкевіча, Уладзіслава Сыракомлі, Францішка Багушэвіча, Янкі Лучыны ды іншых. Усе яны атрыманы з розных сховішчаў Расіі і Польшчы як непасрэдна архівам, так і праз навукоўцаў.

Важную частку крыніц БДАМЛіМ складаюць фонды творчых устаноў, сярод якіх рэдакцыі літаратурна-мастацкіх часопісаў і газеты «Літаратура і мастацтва», нацыянальныя тэатры, кінастудыя «Беларусьфільм», Акадэмія музыкі, Беларуская дзяржаўная філармонія і іншыя. Асобна варта згадаць фонд Беларускага музея імя Івана Луцкевіча ў Вільні. Менавіта ён утрымлівае самую значную колькасць крыніц, што адносяцца да пачатку XX стагоддзя. Гэты дакументальны збор мэтанакіравана ствараўся ў Віленскім музеі на працягу дваццаці пяці гадоў. Адну з самых вялікіх частак архіўнага фонду Музея імя Івана Луцкевіча складаюць матэрыялы беларускіх выдавецтваў, выдавецкіх таварыстваў, а таксама часопісаў і газет. Сярод іх — выдавецкія таварыствы «Загляне сонца і ў наша ваконца» (Пецярбург), Беларускае выдавецкае таварыства ў Вільні, «Мінчук» (Мінск), «Наша хата» (Вільня), рэдакцыі газет «Наша Ніва», «Гоман», «Змаганне», «Голас беларуса», «Народны звон», «Наперад», рэдакцыі часопісаў «Маланка», «Крывіч», «Саха» і іншыя. Менавіта ў рэдакцыях часопісаў і газет захаваліся аўтографы выдатных дзеячаў беларускай літаратуры, у тым ліку Багдановіча, Буйло, Бядулі, Гартнага, Івана Луцкевіча, Эпімах-Шыпілы, Бурбіса. Беларускі музей імя Івана Луцкевіча ў Вільні паспяхова камплектаваў асабістыя дакументы многіх беларускіх дзеячаў: рукапісы, лісты, фотаздымкі і іншае. Сярод імёнаў, чые архівы ці іх часткі захаваліся ў яго зборах, Грыневіч, Якуб Колас, Тарашкевіч, Ластоўскі, браты Луцкевічы, Цётка (Алаіза Пашкевіч) і іншыя.

ВЯРТАННЕ І ПАМЯЦЬ

Самыя розныя абставіны змушалі беларусаў засяляць многія гарады Расіі, прасторы Урала, Сібіры, Казахстанскага стэпу, нязнаныя куткі амаль усіх рэспублік былога СССР. На 1970 — 1990-я гады прыпадае самае актыўнае камплектаванне архіва-музея дакументамі па гісторыі беларускай літаратуры і мастацтва менавіта ў гэтых рэгіёнах. Архіўныя фонды Астапенкі, Брайцава, Бабарэкі, Буйло, Дубоўкі, Ельскага, Жаўрука, Мазалькова, Мачульскага, Садковіча, Любана, Каганца ды іншых былі выяўлены і набыты ў Маскве; Багдановіча — у Яраслаўлі; Бэндэ, Кабзарэўскага, Гарэцкага-Чарняўскай — у Санкт-Пецярбургу; Верас, Талеркі, Тулейкі — у Вільні; Гарбука — у Пяцігорску; Дылы — у Сараце; Ласкова і Баркоўскага — у Якуцку; Сакола, Целеша, Міранавіча — у Латвіі; Ліхадзіеўскага — у Ташкенце. Вялікую ролю ў справе захавання гэтай магутнай спадчыны беларускага народа адыгралі і адыгрываюць іх нашчадкі. На працягу многіх дзесяцігоддзяў старанна зберагаліся ў сем'ях архівы Гарэцкага, Бабарэкі, Жаўрука, Брайцава, Астапенкі, Каганца, Каспяровіча і многіх іншых. Упарадкаваныя і дагледжаныя, яны былі перададзены архіву-музею на захоўванне ў поўным складзе.

Сёння Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва — адзін з унікальных аб'ектаў навуковых інтарэсаў літаратуразнаўцаў, моваznаўцаў, гісторыкаў культуры і даследчыкаў яшчэ цэлага шэрага гуманітарных дысцыплін. Большую частку яго фондаў, звыш васьмідзесяці працэнтаў, складаюць асабістыя фонды дзеячаў літаратуры і мастацтва, а з іх найбольшую колькасць, звыш двухсот дваццаці, — фонды пісьменнікаў. У рукапісах і дакументах, якія яны захоўваюць, адлюстраваны жыццё, дзейнасць іх стваральнікаў і галоўнае — іх творчая лабараторыя. Менавіта асабістыя фонды дзеячаў літаратуры і мастацтва пашыраюць іх бібліяграфію, становяцца асновай для стварэння зборaў твораў і крыніцай нечаканых навуковых адкрыццяў.

Ганна ЗАПАРТЫКА,
дырэктар Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва.

КЛЮЧ, ЯКІ «АДКРЫВАЎ» КРАІНЫ

Як з дапамогай наркотыкаў еўрапейскія ўлады змянялі ход гісторыі і развальвалі імперыі

Наркотыкі не толькі разбураюць арганізм асобнага чалавека, але і вядуць да краху цэлых дзяржаў. Гэта не толькі бізнес, дзе абарочваюцца велізарныя сродкі, але і спосаб уплыву на глабальныя працэсы развіцця цэлых рэгіёнаў. Як з іх дапамогай знішчаліся цэлыя імперыі і да якіх наступстваў вядзе іх распаўсюджванне, у тым ліку і сёння, мы разбіраліся разам з нейрахірургам, навуковым супрацоўнікам аддзялення пухлін галаўнога мозга РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчыкам кафедры неўралогіі і нейрахірургіі БелМАПА Гуменам ГАРБАНІДЖАДАМ.

— Доктар Гумен, не ўсе ведаюць, што наркотыкі — элемент гібрыдных войнаў. Растлумачце, якое месца ў іх яны займаюць?

— Праблема наркотыкаў нашмат глыбейшая, чым толькі іх шкодны ўплыў на арганізм. Яны змянялі ход гісторыі, развальвалі цэлыя імперыі і да цяперашняга часу ўплываюць на эканамічнае развіццё дзяржаў. Урон, які яны наносяць, нашмат большы, чым сучасная зброя.

Адзін з самых старажытных наркотыкаў, опіум, істотна паўплываў на развіццё і знікненне дзяржаў. Як вядома, капіталістычная сістэма існуе каля пяцісот гадоў. Для яе функцыянавання патрэбныя тры асноўныя элементы. Гэта крыніцы таннай рабочай сілы і энергіі, таннай сыравіны і рынак збыту. Калі прыбраць адзін з гэтых элементаў, сістэма праваліцца. І, як вядома, развітыя краіны не маглі б існаваць, калі б не было краін «другога» і «трэцяга» свету. Частку сваіх праблем яны вырашаюць праз краіны, якія развіваюцца, дзе можна танна атрымаць рабочую сілу, сыравіну для сваіх вытворчасцяў. Гэта донары для развітых краін. Таму ментальныя войны — гэта частка руху, які тармозіць развіццё краін «другога» і «трэцяга» свету.

У XVIII — пачатку XIX стагоддзя валавы ўнутраны прадукт Кітая займаў 35 % ад сусветнага. Для параўнання, сёння самая развітая краіна свету, ЗША, мае каля 25 % ад сусветнага ВУП. Гэта была найбагацейшая дзяржава Азіі. І ў той час, і ў цяперашні менталітэт кітайцаў такі, што яны даражаць сваёй культурай, традыцыямі, звычаямі. Дастаткова цяжка туды было пранікнуць іншым дзяржавам, а Вялікабрытанія, захапіўшы ў якасці калоніі Індыю, вельмі імкнулася тое самае зрабіць і з Кітаем. Пасланнік караля Англіі Георга III прыйшоў да кітайскага імператара Цяньлуна, каб наладзіць гандаль, але імператар адказаў: нам Бог даў усё, што неабходна, і нічога нам не патрэбна. Украніцца ў гэтую краіну было амаль немагчыма.

Аднак Кітай быў надзвычай прыцягальным, бо валодаў шэрагам унікальных на той час тавараў — гарбатай, фарфорам, шоўкам, спецыямі. А ўзамен прапанаваць было няма чаго, таму разлічвацца даводзілася срэбрам.

Англічан такая сістэма з перакосам гандлёвага балансу ў бок Кітая не задавальняла. Так пачаліся ментальныя войны з Кітаем. Англічане змяшалі опіум з табакай і перш за ўсё праз сваіх унутраных агентаў пачалі ўкараняць у гэтай краіне. Спачатку тое было дорага, яго курылі афіцэры вышэйшага рангу, высокія чыноўнікі, багатыя прадпрымальнікі. Але паступова ён добра пайшоў, Кітай пачаў актыўна набываць опіум, які паступаў з брытанскай калоніі — Індыі. І менавіта опіумны гандаль і стаў тым ключом, які дапамог «адкрыць» Кітай.

Ментальныя войны часта маюць незваротны характар. Лепш не падсаджвацца на гэту іголку, бо зваротнага шляху няма. Згаданая залежнасць так шырока распаўсюдзілася ў Кітаі і ўжыванне опіуму было такім масавым, што ўжо не хапала ні фарфору, ні шоўку, ні гарбаты, каб разлічыцца. Такім чынам англійскае срэбра з лішкам вярталася ў англійскую казну. Опіум — гэта атрута, і ўкараненне яго з боку іншай дзяржавы можна лічыць генацыдам. Наркатычныя рэчывы за пэўны час забіваюць чалавека.

Калі скрынка опіуму ў Індыі каштавала 130 фунтаў, то ў Кітаі — ужо 600. Брытанцы пачалі зарабляць вялікія грошы, і іх экспарт опіуму дасягнуў 20 %. А ў Кітаі ён стаў часткай традыцыі — яго ўжывалі амаль усе.

Кітайцы не адразу ацанілі ўрон ад опіуму. І эліта, і простыя людзі курылі, усе былі спакойныя і задаволеныя. Кантраляваць іх было прасцей, бо ўсе знаходзяцца ў эйфарыі. Амаль 15 гадоў на гэта не звярталіўвагу, пакуль не зразумелі, што краіна канчаткова паралізавана, і вялікая колькасць сродкаў ідзе толькі на закупку опіуму. І з 1839 года імператар Кітая забараніў увоз опіуму. Увесь наяўны наркотык скінулі ў мора. І атрымалі вялікія пратэсты з боку Англіі.

У 1840 годзе брытанскія ваенныя караблі пачалі вайну з Кітаем. Апошні быў надзвычай аслаблены і супраціўляцца не мог. У вёсцы Сан Юань Лі 800 англічан супрацьстаялі 100-тысячнай кітайскай арміі. І англічане выйгралі.

— Адыграла ролю і тэхналагічная адсталасць краіны на той момант.

— Безумоўна. Але і прымяншаць ролю опіуму нельга. Праз два гады ваеннага супрацьстаяння, у 1842 годзе, быў заключаны Нанкінскі мірны дагавор. Англічане назаўсёды забіраюць Ганконг, выплачаны вялізныя кантрыбуцыі і кампенсацыя за канфіскаваны перад вайной кантрабандны опіум.

Але англічане не перапынялі спроб развяліць імперыю. Паўдзельнічалі яны і ў грамадзянскіх войнах унутры краіны. І англічане, і французы падтрымлівалі розныя групы, кожную забяспечвалі зброяй і ваеннымі парадамі. Гэтыя войны канчаткова аслабілі вялікую імперыю. Пасля па правакацыі Вялікабрытаніі пачынаецца другая опіумная вайна, дзе Англія ваюе супраць Кітая сумесна з Францыяй.

І ўжо з 1860 года заключаны Пекінскія пагадненні на крайне нявыгадных для Кітая ўмовах: поўны кантроль над Кітаем і легалізацыя гандлю опіумам па ўсёй краіне. Кітай у чарговы раз плаціць вялікія кантрыбуцыі Англіі і Францыі, адкрывае парты для гандлю з еўрапейскімі краінамі, дазваляе выкарыстоўваць кітайцаў у якасці рабочай сілы ў калоніях Англіі і Францыі.

Мы бачым, як опіум разваліў імперыю, пазбавіў яе суверэнітэту, зрабіўшы з самабытнай і незалежнай дзяржавы поле для рэалізацыі тавараў і развіцця еўрапейскіх эканомік. Нягледзячы на такі цяжкі ўдар, які Кітай перанёс, ён, як Фенікс, адрадзіўся і стаў зноў вялікай дзяржавай.

— Была ў гэтых войнах і роля Амерыкі...

— Так, хоць не такая заўважная. ЗША таксама хацелі гандляваць опіумам. Яны бралі яго ў Асманскай імперыі, ён быў больш нізкай якасці, чым індыйскі. Пасля Цяньдзіньскага дагавора, калі імператар збег са свайго палаца, яны разрабавалі фарфор, каштоўныя рэчы і падзялілі разам з англічанамі. Потым самі пачалі вырошчваць у Кітаі опіум.

Цікава, што свой першы капітал так зарабіў Дэлано Рузвельт, амерыканскі бізнесмен, дзед прэзідэнта ЗША Франкліна Дэлано Рузвельта. Ён дзякуючы опіуму, прададзенаму ў Кітай, разбагацеў і набыў у Амерыцы шахты, чыгуначныя і нафтавыя кампаніі. Яго сям'я была вельмі багатая і ўплывовая ў ЗША. Потым, калі яго ўнук стаў прэзідэнтам гэтай краіны, былі спробы расследаваць, адкуль сям'я ўзяла свой капітал, але яны нічым не скончыліся.

— Ці ёсць яшчэ прыклады ў гісторыі, калі наркотыкі станавіліся элементамі ўплыву для атрымання палітычных і эканамічных выгод?

— Распаўсюджванне наркотыкаў было характэрнае і для краін Усходу, нават мусульманскіх. Алкаголь там цяжка было прадаць, лягчэй было распаўсюджваць опіум. Існавала цэлая культура курэння. У Іране ў шахаў меліся адмысловыя наборы з золата, дарагога фарфору. А простыя людзі набывалі попел, які заставаўся пасля курэння, у два разы даражэй, чым сам опіум.

Для каланіяльнай Вялікабрытаніі было танней кантраляваць людзей, якія ўжываюць опіум, чым трымаць там цэлую армію. У далейшым гэтыя краіны не маглі нармальна развівацца, бо, пачынаючы ад шаха заканчваючы простым селянінам, усе курылі опіум. А Вялікабрытанія забірала ўсё, што хацела.

— Гэта прыклады часоў каланіяльнай гісторыі Англіі і Францыі. А як цяпер?

— Па неафіцыйных даных, распаўсюджванне наркотыкаў дагэтуль кантралюецца спецслужбамі Амерыкі і Вялікабрытаніі. Мы бачым, як некалькі гадоў таму ў Афганістане з дапамогай амерыканскай арміі знішчана частка макавых палёў з-за неравытворчасці. Гэта зроблена, каб падтрымліваць узровень кошту наркотыкаў у іншых краінах. Калі б яны хацелі пазбавіцца ад наркотыку, то мусілі знішчыць усе палі. На жаль, такая барацьба накіравана не на тое, каб ліквідаваць наркотыкі, а на тое, каб прыбіраць канкурэнтаў.

Трэба сказаць і пра ролю Германіі. Два наркотыкі народжаны ў гэтай краіне — гераін і метамфетамін. Германія здаўна мела добрую базу для вывучэння атрутных рэчываў. І цяпер яны бяруць на лячэнне атручаных людзей. Так было, напрыклад, пасля выкарыстання хімічнай зброі падчас вайны паміж Іранам і Іракам. Насамрэч Германіі гэта было цікава і для даследаванняў.

Дык вось, у 1898 годзе кампаніяй Баер быў вынайдзены гераін як лекі ад туберкулёзу і болевага сіндрому. Сёння ў такіх краінах, як ЗША і Расія, гераін займае першае месца сярод усіх наркотыкаў па распаўсюджанасці. Людзі, якія ўжываюць гераін, доўга не жывуць. Каб дасягнуць стану эйфарыі, з кожным разам дозу варта павялічваць. У выніку яна расце да такой ступені, што наступае перадазіроўка: кроў не паступае ў галаўны мозг, спыняецца дыханне і чалавек гіне.

Гераінавыя наркаманы, калі не ўжываюць дозу, адчуваюць страшныя мышачныя болі, вядомыя як ломка. Фармацэўтычныя кампаніі вынайшлі абязбольвальныя таблеткі для такіх наркаманаў, якія ў выніку таксама выклікаюць залежнасць. У прыватнасці, на тэрыторыі ЗША больш за чатыры мільёны чалавек прымае такія прэпараты.

Другі «падарунак» ад немцаў — метамфетамін, адкрыты ў 1887 годзе выхадцам з Румыніі Лазарам Эдзеланавым. Ён быў забыты і доўга чакаў свайго часу. Падчас Другой сусветнай вайны нямецкае камандаванне зразумела, што калі даваць яго салдатам, яны становяцца бадзёрымі, добра ваююць, у іх знікае пачуццё страху. Метамфетамін таксама прапаноўваўся як лекі для пахудзення і ад паркінсанізму. Насамрэч, людзі, якія яго выкарыстоўваюць, моцна худзеюць, але гэты ж наркотык з'яўляецца прычынай развіцця паркінсанізму.

Яго выкарыстоўваў і Адольф Гітлер. Калі ён вітаўся з генераламі, відаць, як трэсліся рукі — наступства доўгага ўжывання метамфетаміну. Яго ўжывалі ўдзельнікі гурта «Бітлз». У 1960 годзе прэзідэнт ЗША Рычард Ніксан забараніў продаж дадзенага наркотыку. Гэта стала дарагім задавальненнем, ім пачалі гандляваць падпольна. Пасля гандаль перайшоў у Мексіку. Метамфетамін шырока ўкараняецца ў бедных краінах, якія развіваюцца.

— На нашай тэрыторыі, здаецца, наркотыкі прыжываюцца горш...

— У Беларусі сур'ёзныя законы і пакаранне за распаўсюджванне наркотыкаў, і гэта вельмі дапамагае. Але з часоў СССР адной з вялікіх праблем быў і застаецца алкаголь, таксама адна з разнавіднасцяў наркотыку, які выклікае залежнасць. Насамрэч алкаголь не настолькі страшны. Некаторыя віды, як чырвонае віно ці каньяк, могуць прыносіць карысць, але ў невялікіх дозах. Уся праблема — у надзвычайным ужыванні і ўкараненні культуры «Чым больш я магу выпіць, тым большы герой». Алкаголь, як мы ведаем, выклікае дэградацыю асобы і шмат захворванняў, разбурае печань, пагаршае рэпрадуктыўнае здароўе, а гэта вядзе да дэмаграфічных праблем нацыі, папросту — яе вымірання. Каля 30 % смяротнасці ў Расіі звязана з ужываннем алкаголю. Больш п'юць мужчыны, чым жанчыны. За кошт гэтага сярэдняя працягласць жыцця ў мужчын у Расіі меншая, чым у такіх краінах, як Ёмен і Судан. А калі параўноўваць з Заходняй Еўропай, то ў расіяніна яна на 17 гадоў меншая.

Калі да развалу Саюза сярэдняй зарплаты хапала на 10 літраў гарэлкі, то пасля 1994 года, нягледзячы на эканамічны крызіс і абясцэньванне грошай, — ужо на 47 літраў. Піць пачалі больш, і гэта ўзмацняла крызіс у краіне. Толькі ў 2003 годзе ўжыванне алкаголю ў Расіі зменшылася на трэць, з ім пачалі змагацца больш актыўна: павысіліся цэны, пасля 23 гадзін ён не прадаваўся, зменшылася і часткова была забаронена рэклама. Аднак з'явілася іншая праблема — сурагат, што прывяло да масавых атручэнняў.

Яшчэ ў савецкі час лічылі, што змяншэнне продажу гарэлкі прывядзе да страты прыбытку, які мае дзяржава. Але калі палічыць, то адзін рубель прыбытку ад продажу алкаголю прыносіць пяць рублёў урону, бо гэта грошы на ахову здароўя, наступствы ад злачыннасці ў п'яным выглядзе, брак і гібель на вытворчасці. Таму насамрэч дзяржаве больш выгадна, каб людзі пілі менш.

Алена КРАВЕЦ.

«Не прайшло і года, як я ледзь не памёр,

«Прабачце, а ваша прозвішча выпадкова не Тараненка? Я некалі за вас хварэў. Рады бачыць вас у добрым здароўі». Хвілінная сустрэча ў адным са сталічных паркаў, якая перапыніла інтэрв'ю з легендарным спартсменам, паказала, што цяжкую атлетыку ў Беларусі глядзелі і шанавалі. А зрэшты, як можна яе не заўважыць? Асабліва ў 1980-я гады, калі на памосце выступаў Леанід Тараненка. За сваю кар'еру ён зрабіў столькі неверагодных рэчаў, што іншым хапіла б на некалькі жыццяў. У 1980-м выйграў Алімпійскія гульні з сусветным рэкордам, які трымаўся ажно з 1975 года. У рыўку ўзяў 190 кілаграмаў (сусветны рэкорд), у штуршку — 230. Сума 420 кілаграмаў таксама была рэкорднай. І гэта быў толькі пачатак... Леанід Тараненка — адзіны беларускі штангіст, які выступаў на трох Алімпійскіх гульнях. Ён першы сярод беларусаў чэмпіён свету ў першай цяжкай вазе, катэгорыі, якая заўсёды ў штангістаў была прэстыжнай. У гісторыі Беларусі ён адзіны цяжкаатлет, які выйграў чэмпіянаты свету ў першай і другой цяжкіх вагах. Першы і адзіны. Дык чаму ж дзівіцца, што і праз столькі гадоў на вуліцы да яго падыходзяць, каб проста паціснуць руку?..

— Леанід Аркадзевіч, вы родам з Маларыты. Раскажыце, калі ласка, як у савецкі час спорт развіваўся ў невялікіх гарадах.

— Гэта быў час энтузіястаў і іх шчырай адданасці спорту. Калі чалавек таго часу пасябраваў са спортам — гэта было на ўсё жыццё. Такім чалавекам быў мой першы трэнер Пётр Сацюк. У арміі ён атрымаў першы спартыўны разрад па цяжкай атлетыцы. І пасля дэмабілізацыі ў Маларыце арганізаваў секцыю на базе дзіцячай спартыўнай школы. Асноўнымі відамі спорту ў гэтай школе былі лёгкая атлетыка і гандбол. Асобна працавала секцыя барацьбы. Увогуле, гэта ўсе спартыўныя задавальненні, якія былі даступныя дзецям Маларыты таго часу. Таму вялікага выбару, якім відам спорту займацца, у нас не было. Моладзь хадзіла ў асноўным на лёгкую атлетыку. Прыцягвалі экіпіроўкай і кітайскімі кедамі, якія выдавалі бясплатна. Я прайшоў праз лёгкую атлетыку і барацьбу. Дзіцем я быў укормленым і невысокім: у восьмым класе мой рост быў 155 сантыметраў і вага каля 60 кілаграмаў, вагаростаўка прапорцыі не выконваліся. Да таго моманту, як Пётр Паўлавіч Сацюк, а ў тыя часы проста сябар Пеця, арганізаваў секцыю цяжкай атлетыкі, мы з сябрам займаліся атлетычнай гімнастыкай, вядомай як культурызм. Рабілі гэта таемна, па кнізе «Атлетызм: здароўе, прыгажосць, сіла». Чаму таемна? Таму што ў савецкі час культурызм, мякка скажам, не заахвочваўся: буржуазны від спорту, неалімпійскі да таго ж. Адночы мае старанні заўважыў Пётр Сацюк. Ён сказаў, што не патрэбны мне ніякі культурызм, што мне трэба займацца цяжкай атлетыкай, бо ёсць здольнасці. Я да яго прыслухаўся. У секцыю цяжкай атлетыкі я прыйшоў ужо падрыхтаваным, мог прысесці з вагой 100 кілаграмаў на плячах.

— Першыя спаборніцтвы памятаеце?

— Аднаго дня Пётр Паўлавіч зайшоў ва ўпраўленне спорту таварыства «Ураджай». І там даведаўся, што на чэмпіянат патрэбная замена хвораму цяжкавагавіку. Сацюк не доўга думаючы прапанаваў маю кандыдатуру, паабяцаўшы, што я гарантавана выступлю на ўзроўні першага спартыўнага разраду, а то і па кандыдаце ў майстры спорту. І паведаміў мне, што я еду ў Барысаў на чэмпіянат таварыства «Ураджай». На тых спаборніцтвах я заняў месца, далёкае ад прызёраў, але я выканаў нарматыў на першы дарослы разрад у штуршку і нарматыў кандыдата ў майстры спорту ў рыўку. У выніку мне прысвоілі першы спартыўны разрад. І Пеця не падвёў калектыў «Ураджаю», і мяне заўважылі. Той чэмпіянат стаў для мяне, можна сказаць, лёсавызначальным турнірам. Там я ўпершыню ўбачыў сапраўдную штангу. У Маларыце мы трэніраваліся з чыгуннай штангай. Пеця сказаў, што на чэмпіянаце я з-за аднаго выгляду штангі дадам пяць кілаграмаў. І сапраўды, прыгожая ленінградская штанга нават падналалася лягчэй. Пасля таго чэмпіянату мяне сталі запрашаць да сябе многія трэнеры, у тым ліку і мой будучы настаўнік Іван Пятровіч Лагвіновіч.

— Мабыць, ужо тады зразумелі, што хочаце звязаць жыццё са спортам?

— Мяне вабіла неба. З дзяцінства марыў стаць лётчыкам. Пасля школы збіраўся паступаць у Вышэйшае лётнае вучылішча ў Чарнігаве. Я без праблем прайшоў раённую і абласную медыцынскія камісіі. А ў самім вучылішчы не прайшоў. Там рыхтавалі перахватчыкаў на вайсковых самалётах, таму здароўе павінна было быць ідэальным. А я ў дзяцінстве шмат гуляў у хакей, пра шчыткі ў нас нават згадкі не было, таму ад частых падзенняў у мяне пад каленямі ўтварыліся касцяныя нарасты. У вучылішчы мне растлумачылі, што пры палётах на вялікай вышыні пры моцным ціску пачнуцца болі. У лётчыкі мяне не ўзялі. Дзіцячая мара пайшла марна... У Маларыту з Чарнігава я вярнуўся ў жудасным настроі. Але, мабыць, лёсам было наканавана, каб я стаў штангістам. Я прыняў запрашэнне Івана Пятровіча Лагвіновіча і паехаў да яго ў Мінск. Так у лютым 1974 года пачалося маё спартыўнае жыццё. З Іванам Пятровічам у мяне хутка пайшоў прагрэс і ўжо да восені я выканаў нарматыў на званне майстар спорту. Адказна заяўляю, што кілаграмы, якія трэба было падняць, каб выканаць майстра спорту, сёння меншыя, чым у мой час. Хоць колькі часу прайшло. Па ідэі, усё павінна ісці па нарастаючай... Няхай гэта будзе на сумленні цяперашніх функцыянераў і трэнераў, якія працуюць дзеля птушачкі.

— Іван Пятровіч Лагвіновіч у гісторыі айчыннай цяжкай атлетыкі — фігура вельмі значная. Які гэта быў чалавек?

— Унікальны. Кандыдат тэхнічных навук, які пісаў вершы і на свае сродкі адкрыў залу для заняткаў цяжкай атлетыкай. Наша паразуменне было на нейкім касмічным узроўні. Іван Пятровіч спаў і сніў мае рэкорды. На адным з чэмпіянатаў СССР ён мне кажа: «Ты сёння ўстановіш два сусветныя рэкорды. Мне прысніласа, што я сарваў два вялізныя выспелыя яблыкі — гэта твае рэкорды». А мяне тое злавала: ну хто перад спаборніцтвамі гаворыць пра рэкорды? Але супадзенне ці не — тады я сапраўды ўстанавіў два сусветныя рэкорды. Гэта быў вялікі чалавек. Я яго шчыра называў сваім настаўнікам, усе дзівіліся, што я яго так паважаю. А ўсім адказваў, што гэта мой настаўнік, які выхаваў мяне не толькі як спартсмена, але і як чалавека. Я гляджу на цяперашнюю моладзь, на цяперашнюю цяжкую атлетыку і мне робіцца сумна. Узяць, напрыклад, таго ж Андрэя Арамнава — таленавіты спартсмен. Але ў яго не было трэнера, якога б ён паважаў і слухаў. Ён мог бы і пяць Алімпіяд выйграць, калі б побач з ім быў старэйшы надзейны таварыш. Няма было каму накіраваць Арамнава, шкада, што прапаў такі талент.

— Гэта праўда, што Іван Пятровіч настойваў на тым, каб вы атрымалі вышэйшую адукацыю?

— Сапраўды так, для яго гэта было вельмі важна. У верасні 1974 года я пачаў вучобу на першым курсе электрамеханічнага факультэта Беларускага інстытута механізацыі сельскай гаспадаркі. Праз пяць гадоў атрымаў спецыяльнасць «інжынер-электрамеханік». Першыя два курсы я сядзеў на першай парце і пісаў канспекты, усё ж інжынерная спецыяльнасць — гэта складана. З-за збораў я шмат прапускаў, і даводзілася ўсё адпрацоўваць. Але ні разу не браў акадэмічны водпуск. Скажу шчыра, інстытут часам і цяпер сніцца. А першыя дзесяць гадоў пасля яго — дык наогул кожную ноч. Меркавалася, што пасля інстытута я буду працаваць на птушкафабрыцы. Але птушкалова з мяне не выйшла. Дыплом я абараняў у 1979 годзе падчас падрыхтоўкі да Спартакіяды народаў СССР. І ў мяне было двайное свята, калі я спачатку абараніў дыплом, а потым выйграў Спартакіяду.

— Леанід Аркадзевіч, якія ўмовы былі ў савецкіх спартсменаў?

— У наш час добра былі забяспечаны цяжкаатлеты ў Расіі, у паўднёвых рэспубліках, на Каўказе. А мы з Іванам Пятровічам былі самымі беднымі. Жылі на стыпендыю саюзнага значэння, атрымлівалі талоны на харчаванне. Грошай на рукі не давалі, адпаведна, з дабаўкамі, вітамінамі было цяжка. Нашым асноўным «допінгам» была чорная ікра па «казачнай» цане — 40 рублёў за кілаграм. Даводзілася есці ікру. Гэта быў кашмар нейкі. За дзень я з'ядаў сто грамаў чорнай ікры, сто грамаў сала, за месяц з'ядаў трохлітровы слоік мёду. Энергію трэба аднекуль браць. Аснова для кожнага спартсмена і асабліва для штангіста — гэта харчаванне. Яно павінна быць каларыйным, бялкавазмяшчальным, з усімі неабходнымі мікраэлементамі. Калі я ўжо пачаў паказваць вынікі на міжнародных стартах, выйграў Алімпіяду, мяне прымацавалі да магазіна ЦК. А ў закрытых крамах былі свае цэны.

— Акрамя вашай неверагоднай перамогі ў Маскве, чым яшчэ запомніліся Алімпійскія гульні-1980?

— Нягледзячы на тое, што выйграў, Алімпійскія гульні ў Маскве для мяне — падзея сумная. Бо падчас Алімпіяды памёр мой кумір, Уладзімір Высоцкі. Падчас Алімпіяды мы жылі на сваёй трэніровачнай базе ў Падольску. Гэта быў закрыты аб'ект, нават свайкоў не пускалі, каб пазбегнуць правакацый. А калектыў тэатра на Таганцы пусцілі. На жаль, тады Уладзімір Сямёнавіч не прыехаў, але яго сябар паабяцаў, што раскажа яму, якія мы класныя хлопцы, і Высоцкі да нас прыедзе ў наступны раз. Наступнага разу не атрымалася. Праз тыдзень Высоцкі памёр. У Маскве я не адчуў святочнай атмасферы Алімпіяды, пра якую ўсе любяць успамінаць. Мусіць, таму што я думаў толькі аб спаборніцтвах. Праехалі па пустой Маскве ў суправаджэнні міліцыі, выступілі — вось і ўся Алімпіяда. Пасля перамогі нам дазволілі пераехаць у алімпійскую вёску. Я туды прыехаў, нікому да мяне не было справы, усе былі занятыя сабою. І разумеў, што я дзіка стаміўся і хачу дадому. У Мінск мы з трэнерам ехалі абсалютна ў пустым вагоне. Каб стварыць бачнасць, што ўсё добра, у Маскву і з яе ганялі пустыя цягнікі. За перамогу на Алімпіядзе родны «Ураджай» падарыў сур'ёзны падарунак — прыёмнік «Акіян» за 130 рублёў. Дзяржава выдала прэмію — 4900 рублёў чыстымі, а Жыгулі каштавалі 5500.

— У 1983-м вы пранеслі цяжкую хваробу — стафілакокавую інфекцыю. Але ўсё роўна вярнуліся ў спорт. Што вас падштурхоўвала?

— Сапраўды, пры навакаінавай блакадзе пазваночнага дыска мне занеслі стафілакокавую інфекцыю. Са спіны яна распаўсюдзілася ў нагу. Каб выратаваць мне жыццё, зрабілі аперацыю. Як я часам жартую: мяне разразалі ад пяткі да лапаткі. Зрэшты, гэта не жарты, мне разразалі 30 сантыметраў на спіне і ўсю заднюю паверхню сцягна. Курс рэабілітацыі быў вельмі доўгім, 35-сантыметровае шво

Мы разам падкрэсліваем недапушчальнасць выкарыстання спартсменаў у палітычных мэтах

ДАКУМЕНТ ТЫДНЯ. Удзельнікі пасяджэння Савета па фізічнай культуры і спорце краін СНД падпісалі сумесную заяву аб недапушчальнасці дыскрымінацыі спартсменаў. Пасяджэнне прайшло 22-23 верасня ў Ташкенце. У мерапрыемстве ўдзельнічалі прадстаўнікі Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Расіі, Таджыкістана і Узбекістана, а таксама дэлегацыя Выканаўчага камітэта СНД на чале з намеснікам старшыні Выканкама Бекетжанам Жумаханавым. «Дзяржавы — удзельнікі СНД на практыцы пацвярджаюць ролю спорту як аднаго з важных інструментаў забеспячэння міру, сацыяльнай інтэграцыі і ўстойлівага развіцця. Мы разам заўсёды падкрэсліваем недапушчальнасць выкарыстання спартсменаў і спартыўных мерапрыемстваў у палітычных мэтах», — сказаў намеснік міністра спорту РФ Аляксей Марозаў. На сустрэчы таксама былі разгледжаны пытанні, якія датычацца выканання Стратэгіі развіцця супрацоўніцтва краін Садружнасці ў галіне фізкультуры і спорту на 2021—2030 гады. Акрамя таго, члены савета абмеркавалі праект палажэння аб міждзяржаўнай праграме «Спартыўныя сталіцы Садружнасці», дзейнасць базавай арганізацыі дзяржаў СНД у галіне фізічнай культуры і спорту і шэраг іншых пытанняў.

ГЕРОІ ТЫДНЯ. У расійскім Майкопе завяршыліся міжнародныя спаборніцтвы па веласпорце на шашы «Нарт Адыгеі» з удзелам беларускіх спартсменаў. Прадстаўнікі веласіпеднага клуба «Мінск» Яўген Собаль і Сяргей Шаўчэнка заваявалі «серабро» і «бронзу» адпаведна ў групавой гонцы на 170 км. Беларус Марк Грынкевіч стаў пераможцам у гонцы на час сярод моладзі U23. Дыстанцыю ў 23,5 км ён пераадолеў за 28 хвілін і 52 секунды. «Золата» юніёрскай змешанай эстафеты (U19) у складзе аб'яднаной беларуска-расійскай каманды выйгралі беларусы Кірыл Гуцко, Вячаслаў Шпакоўскі і Аляксандр Асталоўскі.

Турнір у Майкопе праходзіў адначасова з чэмпіянатам свету і па яго праграме ў трох узроставых катэгорыях. Акрамя беларускіх і расійскіх веласіпедыстаў, удзел у «Нарце Адыгеі» ўзялі спартсмены з Сербіі, Узбекістана, Казахстана, Туркменістана, Егіпта і Манголіі.

МЕДАЛІ ТЫДНЯ. Беларускія майстры скачкоў на батуце паспяхова выступілі на Кубку Пятра Вялікага ў Санкт-Пецярбургу. У індывідуальных скачках у мужчын першае месца заняў алімпійскі чэмпіён Рыа-2016 Уладзіслаў Ганчароў. Бронзавым прызёрам стаў яшчэ адзін беларус Алег Рабцаў. У сінхронных скачках бела-

Леанід ТАРАНЕНКА:

а ўжо быў пераможцам»

таўшчынёй з палец не расцягвалася, было жудасна балюча і цяжка выконваць элементарныя рухі, не кажучы ўжо пра трэніроўкі. Урачы нават думкі не дапускалі, што я магу вярнуцца ў цяжкую атлетыку. Але ў спорт я вярнуўся. Заўсёды быў упартым хлопцам. Дапамагаў і неверагодны фанатызм да цяжкай атлетыкі, які жыў ува мне і маім трэнеры. Мною рухала жаданне даказаць, што я чагосьці варты ў гэтым жыцці, жаданне паказаць, што мяне не зламаць. Калі б такая ўпартасць ды ў народную гаспадарку, такіх высокіх вынікаў можна было б дасягнуць! Пасля вымушанай бяздзейнасці да штангі пацягнула з новай сілай. У мяне яшчэ шво не зажыло, а я ўжо паднімаў жалеза. Усе спецыялісты былі ў шоку. І толькі Іван Пятровіч у мяне верыў. Сваім вяртаннем у спорт сам сабе даказаў, што я жывучы да немагчымасці. І пераканаўся, што магчымасці чалавечага арганізма бязмежныя. Не прайшло і года, як я ледзь не памёр, а я ўжо быў пераможцам на турніры «Дружба-84».

— Зразумела, што «Дружба-84» не замяніла вам Алімпійскія гульні, якія прапусцілі ўсе савецкія спартсмены. Але чаму вас не было ў алімпійскай камандзе ў Сеуле?

— Не па сваёй волі я не выступіў і на Алімпійскіх гульнях 1988 года. Перада мной паставілі шлагбаум і пазбавілі мяне залатога медаля, які цалкам мог бы быць маім. Мусіць, камусьці ў структуры Дзяржкамспорта Тараненку прыйшоўся не даспадобы. Бруду на нас з трэнерам вылілі вельмі шмат. Нават былі абвінавачанні ў тым, што на нейкім унутраным турніры я нібыта падмяніў допінг-пробы. Хоць усе цудоўна ведалі, што такога быць не магло, бо пробы ў мяне заўсёды былі чыстыя. Мы з Іванам Пятровічам аказаліся занадта лагоднымі і выканалі ўказанне кіраўніцтва адмовіцца ад заяўкі ў Сеул.

— А праз месяц пасля заканчэння Алімпіяды ў Сеуле вы ўстанавілі два сусветныя рэкорды...

— Ізноў ж, дзякуючы Івану Пятровічу. Пісьменнік Герберт Уэлс сказаў, што чалавек, народжаны на Зямлі, не здольны падняць 600 англійскіх фунтаў, што роўна 272-м кілаграмам. Іван Пятровіч вырашыў гэтыя словы абвергнуць. Я, вядома, яго ідэю падтрымаў. Я быў у добрай форме, ды і зарабіць хацелася. Нават у светлыя сацыялістычныя часы людзям былі патрэбныя грошы. Але каб устанавіць гэты рэкорд, трэба было знайсці спонсара. Я выйшаў на прэзідэнта Еўрапейскай федэрацыі цяжкай атлетыкі Холанда. У іх таксама грошай было не надта багата. Таму ён змог прапанаваць мне толькі пяць тысяч фунтаў. А мне толькі палову з той сумы трэба было патраціць на падрыхтоўку. Мяне гэта не задаволіла. Ён спытаў, чаго я хачу. Я сказаў, што хоць бы машыну «Ягуар». Ён акуляры здымае і пытаецца: «Ты што, хіба Гарбачоў, на такой машыне ездзіць?». І так мая спроба «ссякчы» крыху грошай ад Еўрапейскай федэрацыі не скончылася поспехам. Дапамаглі аўстралійцы, якія запрасілі нас на Кубак суперцяжкавагавікоў у Канберу. Тады ў Аўстраліі я падняў 266 кілаграмаў. Мне прапанавалі замахнуцца і на 270. Але мы з трэнерам не пагадзіліся, не было сэнсу сябе ламаць. Узятыя ў штуршку 266 кг і 475 кг — да гэтага часу непераўзыдзеныя рэкорды, унесеныя ў Кнігу рэкордаў Гінеса.



— У 1990-х гадах значна змянілася сітуацыя ў краіне. Рыхтуючыся да Алімпійскіх гульняў у Барселоне, вы гэта на сабе адчулі?

— Калі развальваўся Савецкі Саюз, у зборнай таксама пачаліся разброд і хістанне. Ужо не было той дысцыпліны, як раней. Збіраючыся ў Барселону, усе ведалі, што такім складам мы выступаем апошні раз. За год да Алімпіяды я траўмаваў локаць. Але трэба было ездзіць на камерцыйныя турніры і зарабляць на жыццё, цалкам загаіць яго я не мог. Два месяцы палячыўся, на турніры зноў ірвануў той жа локаць — і паехаў на Алімпіяду хворым чалавекам. Сапернікі ў Барселоне былі слабыя. Усе, акрамя Сашы Курловіча. У яго я выйграць не мог. Са сваім хворым локцем я не мог штурхнуць больш за 240 кілаграмаў. Яшчэ і калена вылецела, як на ліха. У такіх умовах і сярэбраны медаль — нядрэнны вынік.

— На вашу думку, у чым асноўная праблема беларускай цяжкай атлетыкі сёння?

— Няма «матэрыялу». Як з жалеза нельга зрабіць крыло самалёта, так і не з кожнага, хто паднімае штангу, можна выгадаваць добрага цяжкаатлета. Патрэбныя ўнікальныя даныя: гнуткасць, хуткасць, рэакцыя, мышачныя асаблівасці. Трэба валодаць працаздольнасцю. І талент, вядома. Але без працы нават наймацнейшы талент не дасць выніку. Я трэніраваўся па тры разы на дзень. На зборах хлопцы прыходзілі на ранішнюю трэніроўку і яшчэ на лаўках дасыпалі. А я тым часам ужо жалеза цягаў. Каму-небудзь з сучасных штангістаў такое скажы, дык пальцам каля скроні пакруцяць...

— Леанід Аркадзевіч, ваша спартыўная кар'ера атрымалася вельмі драматычнай. Зразумела, што спорт моцна паўплываў на ваша здароўе. Сёння вы аб нечым шкадуеце?

— У маладосці здавалася, што здароўе і магчымасці арганізма бязмежныя. Цяпер разумею, што трэба было больш асцярожна да сябе ставіцца. Не ўяўляю, як мой арганізм змог вытрымаць усе здзекі, якія я яму ладзіў. Усе свае медалі і рэкорды я зарабіў потам і крывёй — у прамым сэнсе. Але я ні пра што не шкадую. Усё было невыпадкова. Я люблю творы Тэадора Драйзера, для мяне гэта гігант думкі. Ён неяк сказаў, што выпадковасць — гэта непазнаная неабходнасць. Гэта насамрэч так. Значыць, мне трэба было прайсці гэты цярністы шлях.

Спорт-тайм

У традыцыйным аглядзе «Звязды» расказваем актуальныя спартыўныя навіны

рускі дуэт Аляксей Дудараў і Себасцьян Станкевіч заваявалі сярэбраны медаль, а Ганчароў і Рабцаў сталі бронзавымі прызёрамі. У жаночых сінхронных скачках беларускі Злата Шалкоўская і Вікторыя Куйдан сталі пераможцамі, а Таццяна Пятрэня і Віялета Бардзілоўская сталі сярэбранымі прызёрамі.

Таксама падчас турніру старшыня Беларускай асацыяцыі гімнастыкі Алена Скрыпель і кіраўнік Федэрацыі скачкоў на батуце Расіі Мікалай Макараў абмеркавалі ў Санкт-Пецярбургу супрацоўніцтва на наступны сезон. Дамовіліся, што расійскія атлеты прыедуць у Віцебск на турнір памяці Валерыя Вагеля, возьмуць удзел у чэмпіянаце і Кубку Беларусі, а таксама ў турніры на прызы Таццяны Пятрэні ў Магілёве. Беларускія батутысты выступяць у Расіі на некалькіх этапах Кубка касманаўтыкі і правядуць збор у Сочы.

ПОСПЕХ ТЫДНЯ. Беларусы выступілі на ўсерасійскіх спаборніцтвах «Легенды пецярбургскага дзюдо». Беларуская каманда заваявала 10 узнагарод. Пераможцамі турніру сталі Арцём Коласаў (да 60 кг), Руслан Галавачоў (да 73 кг), Анастасія Сямёнава (да 70 кг) і Дар'я Канцавая (да 78 кг). Бронзавыя медалі заваявалі Вадзім Шока, Ягор Трухан (абодва — да 73 кг), Даніэль Мукетэ (да 100 кг), Сяргей Якубенка (звыш 100 кг), а таксама Ксенія Даніловіч (да 52 кг) і Яна Макрэцкая (да 63 кг).

Баскетбалісты зробяць крок у будучыню, а барцы пакажуць храбрасць

Дзе сябе могуць праявіць юныя спартсмены

Нягледзячы на ўсе цяжкасці і несправядлівасці, беларускі спорт працягвае жыць і развівацца. І не перастае рыхтаваць спартыўны рэзерв, каб вярнуцца на міжнародную арэну яшчэ больш моцным і баяздольным. Праекты для дзяцей і падлеткаў даўно сталі неад'емнай часткай беларускага спорту. І спыніць іх правядзенне не можа нішто.



Галоўным спартыўным ноу-хау гэтай восені стала першая «Ліга храбрых», арганізаваная Беларускай федэрацыяй барацьбы і Прэзідэнцкім спартыўным клубам. Праект аб'яднаў тры віды барацьбы — вольную, грэка-рымскую і жаночую. Кожная вобласць прадстаўляе сваю каманду саставам па дзесяць спартсменаў 2007-2008 гадоў нараджэння (па адным у кожнай вагавой катэгорыі ў трох відах). У залік уключаюцца паядынкі ў трох відах барацьбы па выніках 30 схватак. Турнір праводзіцца па сістэме з прамым выбываннем. Арганізатары вырашылі праводзіць спаборніцтвы ярка і дынамічна — па суботах раз у два тыдні. Праект стартаваў 10 верасня, ужо адбыліся два чвэрцьфіналы. У першым каманда Магілёўскай вобласці аказалася мацнейшай за каманду Брэсцкай вобласці. Магілёўскія барцы першымі выйшлі ў паўфінал. У другім чвэрцьфінале прадстаўнікі Мінскай вобласці адолелі каманду Гомельскага рэгіёна. Такім чынам, у першым паўфінале сустрэнуцца магіляўчане і мінчане. Удзельнікі другога паўфіналу вызначацца пасля матча барцоў Віцебскай вобласці і гасцей з Масквы (8 кастрычніка) і сустрэчы паміж зборнай Мінска і камандай Гродзенскай вобласці (22 кастрычніка). Паўфінальныя баталіі намечаны на 5 і 19 лістапада, матч за трэцяе месца пройдзе 3 снежня, а пераможцы паўфінальных сустрэч 17 снежня паспрачаюцца за першае месца.

«Мы павінны зрабіць усё, каб вярнуць да барацьбы цікавасць нашых дзяцей. Гэта асноўная задача і мэты лігі. Масавы, дзіцячы спорт — аснова спорту найвышэйшых дасягненняў. Чым больш дзяцей будзе займацца барацьбой сёння, тым больш прафесіяналаў у нас будзе заўтра. Мы, дарослыя, павінны паказваць дзецям, што барацьба — гэта крута, гэта цікава, што ў барацьбе можна шмат чаго дабіцца, — адзначыў старшыня Беларускай федэрацыі барацьбы Алім Селімаў.

Разам з новымі праектамі, паспяхова дзейнічаюць і традыцыйныя. Ужо не першы год выдатнай пляцоўкай для юных баскетбалістаў з'яўляюцца праекты «Крок у будучыню» і «Яе свет — яе правілы». Беларуская федэрацыя баскетбола праводзіць іх разам з Еўрапейскай федэрацыяй. Як расказала генеральны сакратар — выканаўчы дырэктар Беларускай федэрацыі баскетбола Настасся Марыніна, зусім хутка пачнуцца новыя сезоны праектаў: «Мы праедзем усю краіну і прагледзім усіх дзяцей 2011-2012 года нараджэння, якія ўжо некалькі гадоў займаюцца баскетболам. Спецыялістам важна ацаніць іх роставыя даныя, іх здольнасці, навыкі валодання мячом. Будзем падбіраць дзяцей, якія складаюць цікавасць ужо для прафесійнага баскетбола».

Яшчэ адной добрай спартыўнай традыцыяй з'яўляецца знакаміты турнір «300 талентаў для каралевы». Сёлета пачаўся ўжо восьмы сезон праекта, які адкрывае новыя імёны ў лёгкай атлетыцы. Спаборніцтвы традыцыйна праходзяць у чатыры этапы. Першы — папярэдняе тэсціраванне падчас школьных урокаў фізкультуры — праходзіць у гэтыя дні. Затым найбольш здольных атлетаў правераць на паўторным тэсціраванні на спартыўных базах абласцей і горада Мінска. Падчас вясенніх канікулаў пераможцы другога этапу правядуць спартыўныя зборы. І ў красавіку юных атлетаў чакае грандыёзны фінал. «Развіваючы юнацкі спорт, мы вырашаем задачы будучага здароўя нацыі. Бо ў дзіцячым узросце закладваецца падмурак будучага здароўя чалавека, яго будучага актыўнага жыцця. Таму тая работа, якая робіцца па развіцці дзіцяча-юнацкага спорту ў Беларусі, вельмі важная», — падкрэсліў **старшыня БФЛА Іван ЦІХАН** падчас адкрыцця II Адкрытага абласнога турніру па лёгкай атлетыцы памяці Генадзя Валюкевіча. Спаборнцітвы прайшлі ў мінулыя выхадныя ў Ляхавічах.

Для таго каб знаёміцца са спортам і выхоўваць у сабе чэмпіёна мог кожны маленькі беларус, Прэзідэнцкі спартыўны клуб ініцыяваў праект «Спорт для ўсіх». Днямі ў рамках дадзенага праекта ў Дзяржынску была адкрыта новая шматфункцыянальная варкаўт-пляцоўка. Сярод мноства сучасных трэнажораў былі і зоны для баскетбола. Новую пляцоўку адразу ж ацанілі выхаванцы мясцовай спартшколы. Ацанілі высока, без справы трэнажоры не застануцца.

Фота Лізаветы ГОЛАД.

Матэрыялы выпуску падрыхтавала Валерыя СЦЯЦКО.

Извещение о проведении **14 октября 2022 года** повторных аукционных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МЗАЛ им. П.М.Машерова»

Сведения о продаваемом имуществе				
